Грамадскі транспарт з'яўляецца месцам, дзе можна неспадзявана атрымаць траўму. Усё можа абысціся без цяжкіх наступстваў, а можа і скончыцца бальнічным ложкам — як пашанцуе.

СТАР 7

Калі вы робіце выбар на карысць навучання ў 10-11-х класах, то трэба гэтыя два гады правесці з максімальнай карысцю для сябе: трэба вучыцца, працаваць, а не спадзявацца на цуд.

СТАР 7

На возеры Белае сабраліся аматары лавіць ракаў. Чаму «ў цэнтры ўвагі» менавіта ракі? Інтэнсіўнае земляробства з «хіміяй» — угнаеннямі, выкіды шкодных рэчываў, вось яны і сышлі, а зараз ракі вярнуліся.

СТАР 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІПЕНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 140 (27255) Кошт 1300 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

БЮДЖЭТ НА 2013 ГОД ПРЫМЕ ЦЯПЕРАШНІ СКЛАД БЕЛАРУСКАГА ПАРЛАМЕНТА

З такой прапановай звярнуўся Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 23 ліпеня на сустрэчы са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімірам Андрэйчанкам, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«У нас склалася добрая практыка, што цяперашні парламент, пакуль не будзе выбраны новы і не атрымае свае паўнамоцтвы, прымае важнейшыя законы, якія звязаны з бліжэйшым будучым, найперш бюджэт і асноўныя напрамкі развіцця краіны на будучы год», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму я папрасіў бы разам з урадам сур'ёзна прапрацаваць гэта пытанне. Адпаведныя даручэнні ўраду дадзены, і трэба, каб цяперашнія дэпутаты (а гэта вопытныя людзі, якія ў курсе ўсіх пытанняў) прынялі бюджэт і асноўныя напрамкі развіцця краіны, без якіх немагчыма арганізацыя работы на будучы год», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў старшыні Палаты прадстаўнікоў, дэпутаты ўжо актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2013 год. Гэта работа вядзецца сумесна з урадам.

Аляксандр Лукашэнка даручыў вывучыць магчымасць аказання дапамогі ў аднаўленні Крымска.

Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі ў пацярпелыя ад паводкі раёны Краснадарскага края Расіі гуманітарная дапамога была дастаўлена двойчы. У пацярпелы ад паводкі расійскі горад выязджалі беларускія дэпутаты.

СТАР 2

СІТУАЦЫЯ Ў ВАЛЮТНА-ФІНАНСАВАЙ СФЕРЫ БЕЛАРУСІ СПАКОЙНАЯ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 23 ліпеня прыняў з дакладам старшыню праўлення Нацыянальнага банка Надзею Ермакову, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў праінфармаваць яго аб сітуацыі на валютным рынку краіны: «Як спрацаваў Нацыянальны банк і ўся банкаўская сістэма, якая сітуацыя з ліквіднасцю? Мы канстатавалі, што ў нас з'явілася нейкая празмерная ліквіднасць. Якая дынаміка ў гэтым плане?»

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на пытаннях крэдытавання беларускай эканомікі, рэалізацыі дзяржаўных праграм. «Я бачу дынаміку зніжэння стаўкі рэфінансавання. Гэта правільна. Мы павінны ў гэтым напрамку рухацца. Гэта выгадна і дзяржаве, і эканоміцы, і, адпаведна, людзям. Таму ў гэтым напрамку трэба весці работу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся дынамікай па ўкладах насельніцтва, наяўных грошах, якія знаходзяцца ў абарачэнні.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што раней даручаў звярнуць увагу на дзейнасць у Беларусі даччыных прадпрыемстваў і філіялаў замежных банкаў. «Як працуюць замежныя банкі, якое ваша меркаванне? — задаў пытанне Прэзідэнт. — Таму што мне паступала інфармацыя, што некаторыя замежныя банкі сябе паводзяць проста як замежныя агенты ў поўным сэнсе гэтага слова. І прадпрымальнікі ўжо крыўдзіліся на тое, што фінансавая дакументацыя вельмі многіх кампаній капіруецца і адпраўляецца некаторым заказчыкам. Я правяраў. Гэта сапраўды пацвярджаецца. Таму ў свой час я вас прасіў звярнуць на гэта ўвагу. Якія меры неабходна прыняць, можа, трэба і маё ўмяшанне ў гэтым плане?»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што калі замежныя банкі прыйшлі ў беларускую эканоміку, то павінны на яе працаваць, а не проста ўдзельнічаць у цікавых для сябе праектах. «Банкі, якія прыйшлі з замежным капіталам, у асноўным расійскім, на нашым рынку працуюць, крэдытуюць эканоміку», — адзначыла Надзея Ермакова.

Паводле яе слоў, у цэлым сітуацыя ў валютна-фінансавай сферы спакойная. За перыяд з пачатку года на валютна-фондавай біржы Нацбанк скупіў розных валют на суму ў эквіваленце $1,8 млрд.

СТАР 2

СВЯТА НА НАШАЙ ВУЛІЦЫ!

Газета «Звязда» ў гонар свайго 95-годдзя плануе правесці творчую вечарыну і таварыскі турнір па міні-футболе, у якім возьме ўдзел і каманда старэйшай беларускай газеты. Свята адбудзецца на сталічным праспекце імя газеты «Звязда», у дварах і на стадыёне Ліцэя № 1 (Мінск, пр-т газеты «Звязда», 6А) 6 жніўня а 18 гадзіне.

Запрашаем усіх!

Хварэйце за «Звязду»!

Інструктар сталічнай ролер-школы, адзін з лепшых ролераў Беларусі, студэнт БДУІРа 20-гадовы мінчанін Дзмітрый ГОШКА ў палёце на фоне будоўлі 30-павярховага гмаха.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

РОЛЕР-ПІЛАТАЖ

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый ШАЎЦОЎ, палітычны аналітык, дырэктар Цэнтра праблем еўрапейскай інтэграцыі:

«Беларускі спадарожнік каштоўны найперш тым, што да яго на тэрыторыі Беларусі створаны ўласны цэнтр кіравання палётамі. І гэта структура можа падтрымліваць цэлую арбітальную групоўку спадарожнікаў. Такім чынам, у нас узнікла цэлая галіна эканомікі, якая звязана з эксплуатацыяй магчымасцяў касмічнай прасторы ў інтарэсах дзяржавы».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+26°
Віцебск	+ 25°
Гомель	+ 24°
Гродна	+ 25°
Магілёў	+ 23°
Мінск	+ 26°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.07.2012 г.

Долар ЗША	8290,00	▲
Еўра	10030,00	▼
Рас. руб.	256,00	▼
Укр. грыўня	1026,12	▲

ДА ЗОР!

Беларускі спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі паспяхова выведзены на разліковую арбіту, паведаміў начальнік Цэнтра кіравання палётам спадарожніка Уладзімір Юшкевіч.

Рабочая арбіта спадарожніка складае 500-520 км.

Беларускі касмічны апарат (БКА) мае высокія дынамічныя характарыстыкі, гэта значыць, што ён манеўраны і можа аператыўна пераладжвацца на арбіце, каб весці здымку пад патрэбным вуглом. Мэтавая апаратура на спадарожніку — беларуская. Яна выраблена ААТ «Пеленг». Астатняе абсталяванне — замежнае — вытворчасці Расіі і Англіі.

Касмічныя здымкі патрэбныя, перш за ўсё, спецыялістам па картаграфіі і геадэзіі. Больш за палову работ, звязаных з абнаўленнем картаграфічных звестак, праводзіцца з прымяненнем даных касмічнай здымкі. Касмічная інфармацыя таксама высока запатрабавана ў лясной і сельскай гаспадарцы, сістэме Мінпрыроды, МНС. У прыватнасці, ужо падрыхтаваны праграмныя комплексы для ацэнкі снегазапасаў і прагназавання ўраджайнасці сельгаскультур. Цяпер яны праходзяць выпрабаванні. Пакуль нашы міністэрствы і ведамствы выкарыстоўваюць даныя амерыканскіх, еўрапейскіх і японскіх спадарожнікаў. Сабекошт беларускіх здымкаў, паводле папярэдніх разлікаў, павінен быць ніжэйшы, а значыць, гэтыя здымкі будуць больш даступныя для карыстальнікаў.

БЕЛТА.

НАДВОР'Е

ВОСЬ ВАМ І ЧАРГОВАЯ ХВАЛЯ СПЯКОТЫ

Чакаецца, што ў другой палове тыдня прыпячэ ажно да +33—34 градусаў.

Пра гэта паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

А справа ў тым, што на тэрыторыю Беларусі завітаў сур'ёзны антыцыклон з боку Заходняй Еўропы. Фон атмасфернага ціску павялічыўся і ўсталявалася малавоблачнае і сухое надвор'е. У аўторак ападкаў не будзе ўвогуле, а ў сярэдзіне дня паветра прагрэецца да 23—28 градусаў. Захаваецца ўплыў антыцыклону і ў сераду, калі стане яшчэ цяплей. На працягу сутак без ападкаў, тэмпература ўначы плюс 9—16, удзень ад 24 градусаў па поўначы да плюс 30 на поўдні. У Мінску таксама будзе пад 30.

У другой палове тыдня наша краіна ўвогуле трапіць пад уплыў сапраўды гарачых паветраных мас з боку поўдня Еўропы. У чацвер і пятніцу ўначы ад 12 да 20 цяпла, удзень — ад 25 да плюс 33 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Васіль ХВАЦІК:

«Да 2015 года павялічым аб'ём экспарту тавараў у 2,5 раза»

Драгічыншчына — рэгіён Брэстчыны з трывалым прамысловым і сельскагаспадарчым патэнцыялам. Раён рэалізуе важныя сацыяльна-эканамічныя праграмы, павялічвае аб'ёмы вытворчасці і паляпшае якасныя паказчыкі рэальнага сектара эканомікі. Прамысловыя прадпрыемствы наладзілі эканамічныя сувязі з суб'ектамі гаспадарання 25 краін свету. Гандлёвыя маркі «Фрост» і «Экзон» добра вядомыя за межамі краіны. Па валавых аб'ёмах сельскагаспадарчай вытворчасці і яе якасных паказчыках раён традыцыйна трымае вядучыя пазіцыі ў вобласці. Падрабязней аб поспехах і планах расказвае старшыня Драгічынскага райвыканкама Васіль ХВАЦІК.

Аб прамысловых прадпрыемствах

— Прыярытэтным кірункам развіцця прамысловасці па-ранейшаму застаецца стварэнне новай вытворчасці і правядзенне далейшага тэхнічнага пераўзбраення дзеючых прадпрыемстваў і вытворчасцяў. Інвестыцыйная дзейнасць сёлета скіравана на развіццё сельскагаспадарчай галіны, рэалізацыю праграмы жыллёвага будаўніцтва, стварэнне новых прадпрыемстваў, развіццё імпартазамяшчальных вытворчасцяў, уцягванне ў вытворчасць не задзейнічаных дагэтуль плошчаў.

СТАР 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДАМАСК НАЗВАЎ УМОВУ ПРЫМЯНЕННЯ ХІМІЧНАЙ ЗБРОІ

Афіцыйны прадстаўнік сірыйскага ўрада Джыхад Макдзісі заявіў, што яго краіна прыменіць хімічную зброю толькі ў выпадку пачатку замежнай інтэрвенцыі. Пры гэтым ён падкрэсліў, што цяперашні сірыйскі ўрад ні пры якіх умовах не прыменіць баявыя атрутныя рэчывы супраць уласнага насельніцтва. Макдзісі таксама заявіў, што ў цяперашні час запасы хімічнай зброі знаходзяцца пад надзейнай аховай сірыйскай арміі, якая не дапусціць яго трапляння ў рукі тэрарыстаў.

МІНІСТР ЭКАНОМІКІ ГЕРМАНІІ ПРАДКАЗАЎ ВЫХАД ГРЭЦЫІ З ЕЎРАЗОНЫ

Міністр эканомікі Германіі Філіп Рэслер заявіў аб няўдачы грэцкіх рэформаў і, як следства, аб усё больш верагодным выхадзе Грэцыі з еўразоны. «Я настроены больш чым скептычна», — заявіў міністр з нагоды выканання Грэцыяй абавязацельстваў па даўгах. Пры гэтым калі не будуць выкананыя дамоўленасці з міжнароднымі крэдыторамі, то і аб далейшай фінансавай дапамозе не можа быць і гаворкі, а ў рэшце рэшт гэта прывядзе да банкруцтва краіны. «Тады грэкі самі прыйдуць да высновы, што больш разумна выйсці з еўразоны», — падкрэсліў Рэслер.

ЭКАНАМІСТЫ: ЗША ЧАКАЕ РЭКОРДНЫ ЎЗРОВЕНЬ БЕДНАСЦІ

Узровень беднасці ў ЗША дасягне рэкорднага ўзроўню з сярэдзіны мінулага стагоддзя з-за слабой эканомікі і фінансавага крызісу. Пра гэта паведамляе Associated Press, якое апытала больш за дзесяць эканамістаў, што прытрымліваюцца як кансерватыўных, так і ліберальных поглядаў. Спецыялісты прадказваюць, што афіцыйны ўзровень беднасці ў ЗША ў бліжэйшы час падымецца са значэння ў 15,1%, зафіксаванага ў 2010 годзе, мінімум да 15,7%. Такое значэнне паказчыка будзе максімальным з часоў кампаніі супраць беднасці ў 1960-х гадах. Пры гэтым большасць апытаных эканамістаў сыходзяцца ў меркаванні, што афіцыйны ўзровень беднасці можа падняцца яшчэ вышэй. Па іх прагнозах, беднасць ахопіць многія пласты насельніцтва, у тым ліку людзей з няпоўнай занятасцю і сем'і, якія пражываюць у правінцыі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АБАМА АДМОВІЎСЯ РАБІЦЬ БОЛЬШ ЖОРСТКІМІ ЗАКОНЫ АБ ЗБРОІ

Прэзідэнт ЗША Барак Абама не будзе дамагацца ўзмацнення жорсткасці законаў аб зброі, увага да якіх была зноў прыцягнута пасля забойства 12 чалавек у кінатэатры ў горадзе Аўрора (штат Каларада). Як паведамляе The Hill, гэта вынікае з заявы, з якой 22 ліпеня выступіў прэс-сакратар Абамы Джэй Кэрні. Па словах Кэрні, Абама мае намер змагацца са злачынствамі, якія здзяйсняюцца з дапамогай зброі, абапіраючыся на існуючыя законы. На думку Абамы, права грамадзян на зброю, гарантаванае 2-й папраўкай да амерыканскай Канстытуцыі, неабходна абараняць. Нагадаем, у ноч на 20 ліпеня, узброены мужчына адкрыў стральбу ў кінатэатры горада Аўрора. Загінулі 12 чалавек, 58 былі параненыя. Падазроны — 24-гадовы Джэймс Холмс — быў затрыманы. Высветлілася, што зброю, боепрыпасы і выбухоўку, знойдзеную ў яго кватэры, ён набыў законным спосабам.

КОРАТКА

На выбарах дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу пятага склікання ў Беларусі будзе працаваць 6305 участкаў для галасавання, у тым ліку 268 — у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых стацыянарных лячэбна-прафілактычных установах, 39 — у воінскіх часцях, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік.

У алімпійскай вёсцы Лондана ўрачыста падняты дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. У цырымоніі прынялі ўдзел шэф беларускай місіі Сяргей Нерад, генеральны сакратар Нацыянальнага алімпійскага камітэта Георгій Катулін, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Злучаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Аляксандр Міхневіч. На спецыяльна адведзенай для гэтага пляцоўцы арганізатары з дапамогай акцёраў маладзёжнага тэатра разыгралі яркае касцюміраванае шоу з песнямі і танцамі. Асноўны лейтматыў — лонданская Алімпіяда дае шанц стаць чэмпіёнам кожнаму.

У Беларусі ў студзені—чэрвені гэтага года атрымальнікамі дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі на агульную суму Br193,9 млрд сталі 161,9 тыс. чалавек. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года іх колькасць павялічылася на 55 працэнтаў, а сума назначанай дапамогі ўзрасла ў 3,4 раза.

АБРАД ВЯНЧАННЯ: АДРАЗУ ПАСЛЯ АФІЦЫЙНАЙ РЭГІСТРАЦЫІ ШЛЮБУ ЦІ ПАСЛЯ ПРАЦЯГЛАГА СУМЕСНАГА ЖЫЦЦЯ?

Алена РУДЗІНСКАЯ, прыхаджанка Маламажэйкаўскай царквы (Шчучынскі раён):

— Калі з'явілася магчымасць свабодна наведваць храмы, вянчанне стала адным з самых папулярных абрадаў — урачыстых і прыгожых. Але моладзь не заўсёды ўсведамляе прызначэнне і сутнасць гэтага таінства. Абрад вянчання — блаславенне Божае. Невыпадкова кажуць, што шлюбы здзяйсняюцца на нябёсах. Мы з мужам вянчаліся не адразу: час быў такі. Нават дзяцей хрысцілі таемна! А павянчаліся пасля сарака гадоў сумеснага жыцця. Вядома ж, гэта было свядома. Якое было адчуванне, калі над нашымі галовамі ўжо дарослыя сыны трымалі кароны, а побач стаялі ўнукі. Да гэтага таінства трэба прыйсці з Богам у душы. З іншага боку, Боская ласка павінна прысутнічаць у сям'і з самага пачатку, хай нават і несвядома.

Вольга АРЛОЎСКАЯ, спецыяліст па рабоце з кліентамі кантактнага цэнтра «МТС»:

— Мы са сваім мужам вянчаліся адразу пасля таго, як афіцыйна зарэгістравалі свой шлюб. Для нас важней тое, каб шлюб быў заключаны на духоўным узроўні, чым проста з'явіўся штамп у пашпарце. Многія перасцерагалі: мы спяшаемся рабіць такі сур'ёзны ўчынак, не ведаючы яшчэ, што чакае наперадзе. Толькі нам ніякія жыццёвыя выпрабаванні не страшныя: заўсёды памятаем, што кляліся ў любові і вернасці перад Богам.

Ілона АФАНАСЬЕВА, студэнтка:

— Для сучаснай моладзі абрад вянчання — адно з вясельных мерапрыемстваў. Для мяне, як чалавека веруючага, гэта сур'ёзны і адказны крок. Я павянчаюся, калі буду ўпэўнена ў сямейных адносінах. Мы са сваім мужам як пара перш павінны прайсці пэўную колькасць выпрабаванняў, зблізіцца на духоўным узроўні. Вянчанне — ступень, якую трэба дасягнуць, а не пачынаць з яе. Аднак святары кажуць, што калі павянчаешся на пачатку шлюбу — атрымаеш Боскую ласку благадаць. І ў той жа час перасцерагаюць, наколькі гэта сур'ёзны абрад.

Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

ISSN 1990 - 763X

БЮДЖЭТ НА 2013 ГОД ПРЫМЕ ЦЯПЕРАШНІ СКЛАД БЕЛАРУСКАГА ПАРЛАМЕНТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У агульных рысах я валодаю сітуацыяй, але хацелася б больш падрабязна пачуць аб нашых далейшых дзеяннях. Больш за тое, я гэту тэму абмяркоўваў з прэм'ер-міністрам Расіі, ён быў вельмі ўдзячны за тое, што мы аказваем мэтавую дапамогу, тую дапамогу, што вельмі неабходна людзям, якія пацярпелі ад паводкі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Як расказаў Уладзімір Андрэйчанка, кіраўніцтва Крымска звярнулася з просьбай аказаць дадатковую дапамогу ў аднаўленні школы, якая была разбурана ў выніку стыхійнага бедства. Там займаюцца 350 вучняў, з іх 155 з малазабяспечаных сем'яў і дзеці-сіроты.

Аляксандр Лукашэнка даручыў стварыць камісію, выехаць у Крымск, вывучыць стан спраў і ўнесці адпаведныя прапановы па магчымым аказанні дапамогі.

СІТУАЦЫЯ Ў ВАЛЮТНА-ФІНАНСАВАЙ СФЕРЫ БЕЛАРУСІ СПАКОЙНАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Актыўна прадаюць валюту прадпрыемствы. «З усіх сум, якія прадаюць прадпрыемствы на біржы, 55 працэнтаў — гэта абавязковы продаж, а 45 працэнтаў — добраахвотны. Значыць, ёсць такая неабходнасць у прадпрыемстваў не хаваць валютную выручку дзесьці на рахунках, а прадаваць і пускаць у абарот», — сказала кіраўнік Нацбанка.

Акрамя таго, з пачатку года насельніцтва на чыстай аснове прадало больш як $600 млн. Разам з тым, апошнія месяцы па шэрагу прычын аб'ёмы куплі валюты з боку насельніцтва ўзраслі. «У маі было нулявое сальда, у чэрвені адмоўнае. У ліпені насельніцтва таксама больш купляе. Гэта звязана з тым, што павялічыліся даходы, а таксама настала пара водпускаў, і людзі купляюць валюту для таго, каб паехаць за мяжу», — сказала Надзея Ермакова.

Як было даложана кіраўніку дзяржавы, цяперашняе значэнне стаўкі рэфінансавання (31 працэнт) дае магчымасць нарошчваць і падтрымліваць выгаднасць укладаў у нацыянальнай валюце і ў той жа час не дае магчымасці браць празмерныя крэдыты. Стаўка рэфінансавання плаўна зніжаецца, і гэты працэс увязаны з іншымі паказчыкамі ў эканоміцы.

Што датычыцца інфляцыі, Надзея Ермакова сказала: «Мы трымаем руку на пульсе, рэгулюем ліквіднасць, выключаем яе з банкаўскай сістэмы і трымаем стаўку рэфінансавання на тым узроўні, які не садзейнічае павелічэнню інфляцыі».

Паводле слоў кіраўніка Нацбанка, па выніках паўгоддзя інфляцыя знаходзіцца ў тых рамках, якія падлічваліся ў цэлым на год. «І мы не бачым нейкіх пытанняў, каб штосьці змянілася ў адмоўны бок. Калі толькі знешні свет не акажа на нас уздзеяння. Маецца на ўвазе ў першую чаргу Еўропа, тое, як будзе складвацца плацежаздольнасць або пакупная здольнасць нашых прадпрыемстваў і таго рынку, куды мы экспартуем сваю прадукцыю, — адзначыла Надзея Ермакова. — Жыццё пакажа. Дадатковай інфляцыі па залежных ад нас прычынах адбыцца не павінна».

ПРЭЗІДЭНТ НАКІРАВАЎ СПАЧУВАННІ РОДНЫМ І БЛІЗКІМ БАГДАНА СТУПКІ

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы. Як паведамлялася, 22 ліпеня ў Кіеве пасля працяглай хваробы на 71-м годзе жыцця памёр савецкі і ўкраінскі акцёр Багдан Ступка. Ён быў акцёрам тэатра і кіно, працаваў у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Івана Франко ў Кіеве, зняўся ў больш як 90 фільмах. Быў удастоены звання народнага артыста СССР, Героя Украіны, а таксама Дзяржпрэміі СССР і Нацыянальнай прэміі Украіны імя Тараса Шаўчэнкі.

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

ПЫТАННЕ ДА ЭНДАКРЫНОЛАГА

Прафілактыку і лячэнне захворванняў эндакрыннай сістэмы (цукровы дыябет, хваробы шчытападобнай залозы) можна будзе абмеркаваць падчас «прамой лініі» з **загадчыцай аддзялення эндакрыналогіі 1-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталляй Міхайлаўнай ЛІХАРАД**. «Прамая лінія» з яе удзелам адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **сёння з 15.00 да 16.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92**.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары **8 (017) 292 21 03.**

РАРЫТЭТНЫ ПІСТАЛЕТ ХАВАЎ ДОМА

Жыхар Оршы хаваў дома пісталет, які мог бы стаць гонарам музейнай экспазіцыі, прысвечанай гісторыі зброі. Супрацоўнікі Аршанскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце канфіскавалі ў 57-гадовага мужчыны пісталет «CESKA ZBROJOVKA» 1938 года выпуску, калібру 9 мм з магазінам — у рабочым стане. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БЕЛАРУСЫ НЕ ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ «ДРУГОГА ХЛЕБА»

Вяскоўцы, якія жывуць у паўночных раёнах Віцебскай вобласці, у роспачы: пасля зацяжных дажджоў на іх агародах гніе бульба. Ці ёсць пагроза, што сёлета беларусы застануцца без «другога хлеба»? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Васіля ПАЎЛОЎСКАГА.

Паводле слоў Васіля Паўлоўскага, «такіх участкаў, дзе бульба стаіць у вадзе і гніе, у рэспубліцы няшмат. Гэта пераважна нізкія месцы на Віцебшчыне. У тых населеных пунктах, дзе ёсць такая бяда, я думаю, сельгаспрадпрыемствы акажуць дапамогу — кампенсуюць людзям бульбу за невысокую плату».

Што тычыцца рэспубліканскіх маштабаў, то, як запэўніў прадстаўнік Мінсельгаспрама, сёння «па бульбе неблагія віды на ўраджай». Галоўнае, яго не праміргаць. Бо вялікія дажджы, якія ішлі на мінулым тыдні, выклікалі фітафтароз. «Цяпер мы ўзмоцнена змагаемся з фітафторай. Рэкамендавалі гаспадаркам набыць ахоўныя сродкі. Не менш як 6-7 апрацовак давядзецца зрабіць. Бо не сакрэт: чым даўжэй будзе вегетацыйны перыяд бульбы, цукровых буракоў, рапсу, збожжавых, тым вышэй будзе і ўраджайнасць», — рэзюмаваў Васіль Паўлоўскі.

Паводле прагнозаў намесніка міністра, чакаецца добры ўраджай агародніны. У прыватнасці, сёння няма недахопу ў ранняй бульбе, пачаўся збор ранняй капусты, памідораў адкрытага грунту.

«Сёлета плануецца сабраць 8,8 млн тон збожжа»

У сельгасарганізацыях Беларусі ў 2012 годзе плануюць сабраць 8,4-8,5 млн тон збожжа (без кукурузы) у свірнавай вазе. «З улікам фермерскіх і падсобных гаспадарак аб'ём збожжавых чакаецца на ўзроўні 8,8 млн тон, — удакладніў Васіль Паўлоўскі. — Думаю, мы атрымаем дастатковы ўраджай, каб выканаць дзяржзаказ і мець сваё на 100% фуражнае збожжа на корм жывёле. Апошнія два гады практычна не закупляем яго за межамі рэспублікі».

Пастаўляць лішкі збожжа на экспарт не плануецца, бо, як адзначыў Васіль Паўлоўскі, «Беларусь не з'яўляецца экспартаарыентаванай рэспублікай па збожжы». Пры гэтым дадаў, што калі хтосьці з суседніх ці іншых краін звернецца да Беларусі па дапамогу, то рэспубліка пойдзе на гэта... «Калі будуць у кагосьці праблемы па збожжы, не адмовім, але ў першую чаргу мы вырошчваем збожжа для сябе».

Макарона са сваёй пшаніцы

Апошнія некалькі гадоў Беларусь закупляла харчовую пшаніцу: у 2010 годзе — 6 тысяч тон, у 2011-м — 12 тыс. тон. «У 2012 годзе мы плануем максімальна скараціць аб'ёмы закупкі харчовай пшаніцы, — адзначыў намеснік міністра. — Бо і з нашай пшаніцы можна вырабляць якасную макарону». У якасці прыкладу Васіль Паўлоўскі прывёў паспяховы вопыт аднаго з Мінскіх прадпрыемстваў хлебапрадуктаў, дзе працуе новая лінія па вытворчасці макаронных вырабаў на айчыннай сыравіне.

Надзея ДРЫЛА.

ПАЖАРНЫЯ ЎМЕЮЦЬ СВЯТКАВАЦЬ

Іх святы-шоу заўсёды выклікаюць самы непадробны інтарэс. У мінулую суботу ў сталічным дзіцячым парку імя Горкага і на галоўным гарадскім праспекце адбыўся парад пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі і духавых аркестраў МНС — у гонар Дня пажарнай службы, які прынята адзначаць 25 ліпеня. Шматлікія гледачы ўбачылі тэхніку, якая знаходзілася на ўзбраенні беларускіх пажарных і выратавальнікаў у розны час. За колішнімі ўзорамі сродкаў барацьбы з агнём па праспекце рушыла самая сучасная вогнетушыльная аўтатэхніка. Акрамя незвычайнай выстаўкі мінчан і гасцей сталіцы весялілі артысты-аматары, працавалі гульнявыя пляцоўкі і нават палявая кухня.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

МАБІЛЬНАЯ СУВЯЗЬ ДАРАЖЭЕ. АЛЕ НЕ ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ...

З 1 жніўня аператар сотавай сувязі СТАА «МТС» мае намер павысіць тарыфы на некаторых тарыфных планах: павышэнне тарыфаў закране абаненцкую плату, а таксама ўнутрысеткавыя і міжсеткавыя званкі.

Кошт SMS-паведамленняў, міжнародных званкоў, міжнароднага роўмінгу і паслуг мабільнага інтэрнэту застанецца ранейшым. Павышэнне тарыфаў не закране і сацыяльна арыентаваныя тарыфныя планы «Асаблівы» і «Блізкі. Для пенсіянераў». Ранейшымі застануцца таксама і памеры штомесячных плацяжоў за абсталяванне ў рамках заключаных дагавораў. Нагадаем, што апошні раз аператар сотавай сувязі МТС павышаў свае тарыфы сёлета 12 сакавіка, але сацыяльна арыентаваных тарыфных планаў гэтае павышэнне не закранула.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У МІНСКУ ЎСТАНАВІЛІ РЭКОРД СНД

Над сталіцай адначасова паднялося 5000 шароў. І менавіта столькі жаданняў беларусаў павінна быць выканана, бо амаль у кожным шарыку знаходзілася запіска з іх самымі запаветнымі марамі. Арганізатары паклапаціліся пра тое, каб у акцыі прыняў удзел кожны ахвотны. І з самай раніцы ў Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага дзяжурыла спецыяльная каманда, якой можна было аддаць сваё пасланне.

— Ідэя запуску шароў была спантаннай. Ужо пазней мы падумалі пра тое, што можам устанавіць рэкорд, — распавяла арганізатар, брэнд-менеджар кампаніі «Данон» у Беларусі Дар'я Яфрэмава. — А потым вырашылі даць магчымасць кожнаму чалавеку асабіста паўдзельнічаць у гэтым мерапрыемстве.

Надзея БУЖАН, фота аўтара.

ЗАБІЛІ СТУДЭНТА

Жыхары шматкватэрнага дома ў Савецкім раёне Гомеля спалохаліся, калі днём адчулі пах газу ў пад'ездзе, і адразу ж звярнуліся ў адпаведныя службы. Аднак супрацоўнікам аварыйнай службы газавай сеткі давялося тэрмінова выклікаць міліцыю, бо ў кватэры, што стала крыніцай уцечкі газу, знаходзіўся труп маладога чалавека з прыкметамі гвалтоўнай смерці. Пры гэтым усе канфоркі пліты былі наўмысна адкрыты. Галоўны інспектар групы інфармацыі і сувязі з грамадскасцю ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава расказала, што 19-гадовы студэнт адной з ВНУ Гомеля быў забіты. Па падазрэнні ў здзяйсненні забойства ўжо затрыманы два жыхары Гомеля. Аднаго з іх, непаўналетняга, супрацоўнікі Следчага камітэта і крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама знайшлі ў Жыткавічах. Другога, аднагодка забітага, — у абласным цэнтры. Паводле асноўнай версіі следства, злачынцы, якія былі знаёмыя са студэнтам непрацяглы час, паквапіліся на маёмасць маладога чалавека.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ У свеце

ТЭРАРЫЗМ І НАРКАГАНДАЛЬ: ЛЯГЧЭЙ ПРАЦУЕЦЦА ПРЫ САДЗЕЙНІЧАННІ НАЙБУЙНЕЙШЫХ ЗАХОДНІХ БАНКАЎ

16 ліпеня 2012 года падкамітэт Сената ЗША па расследаваннях у галіне нацыянальнай бяспекі апублікаваў даклад, які зрабіў сапраўдны фурор — адзін з найбуйнейшых заходніх банкаў свету, брытанскі HSBC аказаўся вінаватым у шматгадовым садзейнічанні тэрарыстам і наркагандлярам.

Грамадскасць ужо прывыкла да скандалаў, звязаных з адмываннем наркагрошай або пераводамі для тэрарыстычных мэтаў у невялікіх банках, якія часта і ствараюцца выключна для гэтай мэты. Гэта ў прынцыпе зразумець можна — невялікіх банкаў у свеце дзясяткі тысяч, ствараюцца яны на самых розных нацыянальных пляцоўках, з прававым рэгуляваннем, якое адрозніваецца, і прасачыць за іх дзейнасцю вельмі складана. Але калі крайне непрыстойнымі справамі, якія прама пагражаюць нацыянальнай бяспецы, ды яшчэ ў такіх каласальных аб'ёмах, ціхамірна займаюцца пры пасрэдніцтве аднаго з найбуйнейшых банкаў свету, які ў тэорыі павінен знаходзіцца пад пастаянным пільным назіраннем нацыянальных рэгулятараў і спецслужбаў, — гэта шакіруе.

Спецыялістаў па спыненні гандлю наркотыкамі, у прыватнасці, проста ўразіў наступны факт. У 2007—2008 гг. аддзяленне HSBC у Мексіцы прыняло ў буйных кліентаў 7 мільярдаў долараў наяўнымі для пераводаў у аддзяленні на тэрыторыі ЗША. Відавочна, што сур'ёзныя бізнэсмены ў Мексіцы ўжо даўно не вядуць легальныя справы з такой колькасцю наяўных, ды яшчэ ў краіне, якая славіцца арганізаванай злачыннасцю, якая не ўпусціць выпадку тут жа абрабаваць неасцярожнага бізнэсмена. Дазволіць сабе спакойна распараджацца ў крымінальнай Мексіцы такімі сумамі наяўных могуць толькі тыя, хто абрабаванняў не баіцца — найбуйнейшыя наркакартэлі, у якіх на службе ўтрымліваюцца тысячы ўзброеных да зубоў баевікоў.

Ці маглі банкаўскія чыноўнікі ў Мексіцы, якія прымалі да пераводаў такія сумы наяўнымі, не ведаць пра гэта? Не маглі, улічваючы, што HSBC можа дазволіць сабе наймаць на працу самых лепшых прафесіяналаў, якія цудоўна ведаюць усе асаблівасці мясцовай фінансавай дзейнасці. Ці магчыма паверыць у тое, што амерыканскія банкіры, якія атрымлівалі такія сумы з Мексікі, ні разу не засумняваліся, на што яны могуць быць накіраваны? І ў гэта немагчыма паверыць, калі ўзгадаць, якую актыўную інфармацыйную работу па барацьбе з банкаўскімі пераводамі ў наркагандлі вядзе амерыканскае Упраўленне па барацьбе з наркотыкамі. А калі яшчэ ўлічыць, што гэтыя сумы шматразова паступалі на рахункі асоб, западозраных у наркагандлі, якія ў самім банку знаходзіліся ў спісе падазроных, намечаных для закрыцця, але так і не былі закрыты, то паводзіны чыноўнікаў HSBC пачынаюць набываць і зусім злавесны характар.

Што датычыцца садзейнічання ў фінансаванні тэрарызму, то ў гэтай сферы выявілася: HSBC цесна супрацоўнічаў з банкамі, якія фінансавалі вельмі сур'ёзныя сеткі свету. У прыватнасці, у Саудаўскай Аравіі брытанскі банк устанавіў вельмі блізкія стасункі з банкам, які ЦРУ падазрае ў тым, што яго заснавальнік быў адным з першых фінансавых спонсараў знакамітай Аль Каеды. Не далей як у 2010 годзе аддзяленне HSBC у Саудаўскай Аравіі забяспечыла гэты банк мільярдам долараў наяўнымі купюрамі — а што можа быць больш зручна для фінансавання тэрарыстаў, чым наяўныя! Меў HSBC цесныя стасункі і з банкамі ў Бангладэш, якія таксама падазраюцца ў фінансаванні тэрарызму.

Дасталося на арэхі і ўрадавым рэгулятарам, якія павінны былі сачыць за легальнасцю дзейнасці банка на тэрыторыі ЗША. Павінны былі, але не сачылі.

Цікавыя каментарыі амерыканскіх грамадзян, якія яны пакінулі, абмяркоўваючы артыкул на сайце CNN. Адзін з іх коратка піша: «Мяне ДАСТАЛА адсутнасць этыкі ў банкіраў, Уол-стрыта і эліты». Другі адклікаецца: «Тэрарысты! Слова, прыдуманае ўрадам ЗША, у той час як найбуйнейшым спонсарам і распаўсюджвальнікам тэрарызму ў глабальных маштабах з'яўляецца сам урад ЗША. Сур'ёзна, праводжу даследчую работу наконт гэтага». Трэці піша: «Калі вы дасце чалавеку пісталет, ён можа абрабаваць банк. Калі вы дасце чалавеку банк — ён можа абрабаваць увесь свет». Чацвёрты наведнік сайта: «Людзі не разумеюць, што адмаўленне ад рэгулявання вызваляе карпарацыі і банкі ад нагляду. З кожным адмененым відам рэгулявання іх дзейнасці звычайныя людзі трапляюць усё больш і больш у слугаванне багацеям». Пяты наведнік адклікнуўся наступным чынам: «Калі вы хочаце спыніць наркагандаль, арыштуйце банкіраў. Смяротнае пакаранне для банкіраў, якія маюць справу з наркаграшыма! Наркагандаль пасля гэтага знікне на працягу месяца». Яшчэ адзін наведнік піша: «Навошта нават казаць што-небудзь? Нічога не здарыцца ні з адным босам з HSBC, і ўсе тут ведаюць пра гэта. Яны могуць адмываць грошы для каго хочаш, але ў вас адбяруць ваш дом або вашу крэдытную картку». У яшчэ адным каментары песімістычна гаворыцца: «Усе банкіры і банкі, якімі яны кіруюць, сталі карумпаванымі бастыёнамі прагнасці. На жаль, усе лідары адналькава скампраметаваныя. Свет коціцца ў пекла».

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

■ У краіне

РАСІЯ І «ПРАРАСІЙСКАЯ АПАЗІЦЫЯ» — СУПЯРЭЧЛІВАСЦЬ ПАЗІЦЫІ

Новая палітычная сіла ў Беларусі — прарасійская апазіцыя — мае даволі моцныя зыходныя пазіцыі, бо абапіраецца на тэндэнцыю да эканамічнай і палітычнай інтэграцыі. Але ў той жа час трэба прызнаць і тое, што пазіцыя расійскага кіраўніцтва ў дачыненні да глабальнага крызісу з'яўляецца супярэчлівай, і гэтая супярэчлівасць робіць пазіцыю прарасійскай апазіцыі ў Беларусі вельмі кволай.

У 2011—2012 гадах расійскае кіраўніцтва, мабыць, упершыню за апошнія 20-25 гадоў пачало адыгрываць ролю лідара інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы. Распачаўшы працэс еўразійскай інтэграцыі, Масква здолела навязаць краінам-партнёрам той фармат інтэграцыі, які больш адпавядае яе інтарэсам (менавіта ў тым выглядзе, як іх разумее расійскі істэблішмент). Больш за тое, на працягу 1,5 года Крэмль здолеў захаваць ініцыятыву ў гэтым працэсе і не страціць дынаміку.

Тыя, хто разглядаў праект Еўразійскага саюза як нейкую спробу Масквы супрацьстаяць працэсу глабалізацыі і стварыць уласную цывілізацыйную супольнасць, відавочна, памыляліся. Еўразійскі саюз з'яўляецца працягам еўрапейскай інтэграцыі Расіі, формай набліжэння Расіі да Еўропы і ЗША. Зразумела, заходнія палітыкі хвалююцца, каб гэты інтэграцыйны працэс неператварыўся ва ўзнаўленне СССР, але рэальных перадумоў для гэтага сёння няма. Як справядліва гаворыць вядомы беларускі аналітык Юрый Шаўцоў, Еўразійскі саюз — гэта форма забеспячэння адзінства Еўропы, а не яе раздзялення.

І вось тут узнікае сапраўды няпростае пытанне: а на якіх умовах будзе ажыццяўляцца гэтае набліжэнне Расіі (у фармаце Еўразійскага саюза) і Вялікай Еўропы?

З аднаго боку, відавочна, што за гэтай ініцыятывай Уладзіміра Пуціна ёсць сур'ёзныя дамоўленасці паміж расійскім і еўрапейскім (перш за ўсё, нямецкім) бакамі. І агульны змест гэтых дамоўленасцяў менавіта ў тым, што Расія будзе для Еўропы надзейным пастаўшчыком сыравіны і рынкам збыту, а Еўропа і ЗША дазволіць расійскаму капіталу ўдзельнічаць у сваіх эканоміках (набываць актывы), дадуць доступ да сваіх тэхналогій і ўключаць Расію ў агульнаеўрапейскую сістэму бяспекі.

З другога боку, таксама відавочна, што ў рэалізацыі такіх маштабных дамоўленасцяў спадзявацца на адны толькі дамоўленасці ніводны з бакоў не можа сабе дазволіць. І вось тут узнікае праблема: падпарадкоўваючы сваю ўнутраную і знешнюю палітыку задачы еўрапейска-еўразійскай інтэграцыі, расійскае кіраўніцтва, акрамя цэлага шэрагу даволі адчувальных выдаткаў, пачынае страчваць саму здольнасць да раўнапраўнага дыялогу з Еўропай і ЗША.

Напрыклад, адна справа — калі Расія захоўвае прыязны нейтралітэт у дачыненні да ваеннай аперацыі ЗША і НАТА ў Афганістане. І зусім іншая справа — калі Расія размяшчае на сваёй тэрыторыі транзітную базу НАТА, дазваляе транзіт праз сваю тэрыторыю ваенных грузаў, у тым ліку і пры дапамозе паветранага транспарту. Перамяшчэнне вайскоўцаў НАТА праз тэрыторыю Расіі на сваіх ваенных самалётах патрабуе інфармавання НАТА аб кодах доступу да паветранай прасторы і інфраструктуры кантролю і паветранай, і зямной прасторы Расіі. А гэта, на думку аднаго з вядучых расійскіх інтэлектуалаў Юрыя Грамыкі, ва ўмовах крытычнай ролі авіяцыйна-касмічных тэхналогій для арганізацыі баявых дзеянняў і ёсць фактычная капітуляцыя.

Аналагічная сітуацыя — у эканоміцы. Адна справа — у абмен на сыравіну імпартаваць тэхналогіі і ствараць суверэнную прамысловую сістэму. І іншая — адкрываць сваю эканоміку і далучацца да СГА, не маючы стратэгіі прамыслова-тэхналагічнага развіцця, моцнай перапрацоўчай прамысловасці і развітога ўнутранага рынку. Апошняе азначае, што вельмі хутка ў Расі не будзе не толькі моцнай перапрацоўчай прамысловасці, але і самой магчымасці такую прамысловасць стварыць.

Каб далучацца да заходніх інстытутаў на найбольш спрыяльных умовах, Расія павінна была б падыходзіць да адпаведных крокаў з найбольш моцнымі пазіцыямі (у ваеннай, эканамічнай, навукова-тэхналагічнай і іншых сферах). Калі ж гэта не адбываецца, то, па сутнасці, расійскае кіраўніцтва вымушана будзе спадзявацца на сумленнасць сваіх заходніх партнёраў. Нават у спрыяльных умовах стабільнай міжнароднай сітуацыі гэта было б занадта рызыкоўна. А ў перыяд пачатку другой хвалі глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу, якая ўжо суправаджаецца ўзброенымі канфліктамі па ўсёй планеце, падобная стратэгія выглядае вельмі ненадзейнай.

Справа не ў тым, што Захад агрэсіўна ставіцца да Расіі. Так гэта ці не — прадмет асобнай размовы. З пункту гледжання барацьбы інтарэсаў, справа ў тым, што ў перыяд крызісу тыя выдаткі, якія нясуць заходнія дзяржавы і карпарацыі на традыцыйных рынках, яны будуць імкнуцца кампенсаваць на іншых рынках альбо з дапамогай нярынкавых сродкаў — такіх, як ваенныя канфлікты.

Такім чынам, сёння Расія, з аднаго боку, будуе Еўразійскі саюз і імкнецца да таго, каб стварыць моцную рэгіянальную групоўку (як эканамічную, так і палітычную). З другога боку, па прычыне нізкай якасці кіраўніцкіх рашэнняў, адсутнасці стратэгіі прамыслова-тэхналагічнага развіцця, а таксама стратэгіі рэгіянальнага і сацыяльнага развіцця, развіцця ўнутранага рынку Расія страчвае здольнасць да эфектыўнага і паўнавартаснага дыялогу з заходнімі эканамічнымі і палітычнымі структурамі.

Гэтая супярэчлівасць пазіцыі Масквы адбіваецца на палітычнай пазіцыі ўсіх прарасійскіх сіл на постсавецкай прасторы і за яго межамі, у тым ліку ў Беларусі. «Прарасійская апазіцыя» ў нашай краіне не можа выпрацаваць паслядоўную лінію — ні ў кароткатэрміновай перспектыве, на час выбарчай кампаніі, ні ў доўгатэрміновай. Таму і слова «прарасійская апазіцыя» ў дачыненні да гэтых палітычных структур можна ўжываць даволі ўмоўна.

Але ж паколькі прамаскоўскія структуры імкнуцца заняць тую ж пазіцыю, на якой знаходзіцца беларускае кіраўніцтва (пазіцыю прыхільнікаў інтэграцыі), то тыя праблемы, з якімі сутыкаюцца «прарасійскія» структуры ў Беларусі пры выпрацоўцы палітычнай стратэгіі, у той ці іншай ступені ўласцівыя і для самой беларускай улады.

Юры ЦАРЫК,
палітычны аналітык, кіраўнік Грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы

АБЗАЦ

Памятны знак ахвярам Халакоста ўстаноўлены ў Баранавіцкім раёне. Ён адкрыты ў в. Моўчадзь на месцы масавага пахавання яўрэяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. 15-18 ліпеня 1942 г. тут было расстраляна больш за 3 тыс. яўрэяў. Цырымонія адкрыцця манумента прайшла з удзелам прадстаўнікоў пасольстваў, мясцовай адміністрацыі, рэспубліканскіх яўрэйскіх арганізацый, мясцовага насельніцтва.

Двайное забойства адбылося ў Аршанскім раёне. Позна ўвечары два пастухі 1979 і 1985 г.н. зайшлі ў дом пажылых сужэнцаў у в. Баяры ў пошуках спіртнога. Целы абаіх пенсіянераў са слядамі нажавых раненняў раніцай выявіла і паведаміла ў міліцыю сястра загінулай. З дому пацярпелых знікла 6 бутэлек віна і бензапіла. Заведзена крымінальная справа.

ПОЎНЫ АБЗАЦ

У невялікім літоўскім горадзе Дусятас прайшоў штогадовы конкурс паядання ракаў. На гэты раз за перамогу змагаліся 5 жанчын і 23 мужчыны. Спаборнічалі не на хуткасць паядання і не на колькасць з'едзенага. Мэта — з'есці рака найбольш якасна. Удзельнікам на спажыванне порцыі далікатэсу адводзяць 5 хвілін. Пераможцу вызначаюць проста: спачатку цэлага рака ўжываюць, а потым узважваюць тое, што ад яго засталося пасля трапезы. Выйграў конкурс чалавек, які з'еў амаль 58% ад агульнай вагі членістаногага. Аднак рэкорд пабіты не быў: некалькі гадоў таму адзін з удзельнікаў спажыў 70% ад агульнай масы рака.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белэнергозащита» состоится 24 августа 2012 года в 11 часов 00 минут по месту нахождения общества: г. Минск, пер. Бехтерева, 7, актовый зал ОАО «Белэнергозащита».

Собрание проводится в очной форме. Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания. Время начала регистрации: 10 часов 00 минут. Время окончания регистрации: 10 часов 45 минут.

Дата формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого будет составлен список лиц, имеющих право на участие в собрании: 20 августа 2012 года.

Повестка дня собрания:

1. О внесении изменений в Устав ОАО «Белэнергозащита», утвердив его в новой редакции.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, будет осуществляться в рабочие дни и рабочее время с 13 по 23 августа 2012 года по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, 7, комн. 301, а в день проведения собрания — во время и в месте проведения собрания.

Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

Наблюдательный совет ОАО «Белэнергозащита».

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні КІЕЎЦА Івана Міхайлавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі з раптоўнай смерцю члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні КІЕЎЦА Івана Міхайлавіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Драгічынскі раён

«ДА 2015 ГОДА ПАВЯЛІЧЫМ АБ'ЁМ ЭКСПАРТУ ТАВАРАЎ У 2,5 РАЗА»

Аб прамысловых прадпрыемствах

— За 5 месяцаў у эканоміку раёна інвеставана крыху больш за 94 млрд рублёў. У чэрвені ААТ «Экзон» завяршыў рэалізацыю першай чаргі інвестыцыйнага праекта «Рэканструкцыя з арганізацыяй вытворчасці новых лекавых формаў». З удзелам замежнага капіталу рэалізуецца інвестыцыйны праект «Арганізацыя вытворчасці нятканых матэрыялаў метадам тэрмасклейвання». Заключаны інвестыцыйны дагавор паміж Антопальскай ватнапрадзільнай фабрыкай і Міжнароднай гандлёвай кампаніяй «ЦзянсуВэйда». У чацвёртым квартале гэтага года плануецца арганізаваць вытворчасць такой імпартазамяшчальнай прадукцыі, як флізелін.

Пашырыць экспартны патэнцыял і геаграфію экспарту плануе ААТ «Экзон» — у прыватнасці павялічыць адгрузку лекавых сродкаў і біялагічна актыўных дабавак у Расію, Грузію, Украіну, Казахстан, Малдову, Прыбалтыку. Сёлета ўпершыню выйшла на знешнія рынкі ПУВГП «Мірон», асноўным відам дзейнасці якога з'яўляецца вытворчасць мяса і мясных прадуктаў. Да 2015 года мы плануем павялічыць аб'ём экспарту тавараў у 2,5 раза да ўзроўню 2012 года.

Аб аграрным сектары

— У склад агрtoпрамысловага комплексу раёна ўваходзяць 16 сельскагаспадарчых арганізацый рознай формы ўласнасці — 12 сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў, дзяржаўнае прадпрыемства «Племянны завод «Заказельскі», прыватнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Гутава», ААТ «Драгічынскі камбікормавы завод», які мае сельскагаспадарчы ўчастак са свінаводчым комплексам, а таксама ААТ «Драгічынскі райаграсэрвіс». Сельскагаспадарчую прадукцыю вырабляюць і 12 фермерскіх гаспадарак (іх доля ў агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі нязначная — 0,6 працэнта).

Звыш 70 працэнтаў выручкі ад рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі фарміруецца дзякуючы жывёлагадоўлі — у прыватнасці, рэалізацыі малака. Яркім прыкладам укладання інвестыцый у сельскую гаспадарку з'явілася будаўніцтва ў 2009 годзе малочнатаварнай фермы «Осаўцы-2» у СВК «Асавецкі» на 720 галоў. З увядзеннем у эксплуатацыю фермы толькі за 2010-2011 гады валавая вытворчасць малака па гаспадарцы выросла больш чым у 1,5 раза. 83 працэнты малака вырабляюцца гатункам экстра — гэта больш за 40 працэнтаў раённай вытворчасці малака высокай якасці. Значна скараціліся затраты працы:

Вядучы спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы Ірына ЖЫГАР.

пагалоўе ў 720 галоў абслугоўваюць тры даяркі. Рэнтабельнасць малака па ферме склала летась 95 працэнтаў. Сёння СВК «Асавецкі» з'яўляецца самай моцнай у фінансавым і вытворчым сэнсе гаспадаркай раёна.

Летась уведзены ў эксплуатацыю пасля рэканструкцыі яшчэ 5 малочнатаварных фермаў. Рэканструкцыя 14 малочнатаварных фермаў адбываецца за кошт уласных сродкаў.

За насельніцтвам раёна замацавана 5 тыс. га сельскагаспадарчых угоддзяў. Праз сістэму райпа насельніцтва забяспечваецца мінеральнымі ўгнаеннямі, насеннем, сродкамі абароны раслін, сельгасінвентаром. Сельгасарганізацыі і Драгічынскі камбікормавы завод забяспечваюць насельніцтва кармамі. У шэрагу гаспадарак адпрацавана цэнтралізаваная сістэма пасадкі, апрацоўкі і ўборкі зерневых і бульбы з наступнай аплатай выкананых работ. 12 сельскагаспадарчых арганізацый раёна і 6 сельвыканкамаў ажыццяўляюць нарыхтоўку малака ад насельніцтва.

Дырэктар Драгічанскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Наталля КАРАЛЮК.

Аб партнёрстве з бізнэсам

— У нас зарэгістраваны 694 суб'екты прадпрымальніцтва, у тым ліку 573 індывідуальныя прадпрымальнікі. Колькасць недзяржаўных прадпрыемстваў няўхільна расце, толькі за 5 месяцаў гэтага года створаны 7 прадпрыемстваў. Прадстаўнікі малога бізнэсу выплачваюць у бюджэт каля 20 працэнтаў паступленняў.

Аб прыродзе і культурнай спадчыне

— Шырокую вядомасць у эколагаў Еўропы набылі біялагічныя заказнікі «Спароўскі» і «Званец», якія з'яўляюцца Рамсарскімі ўгоддзямі. Заказнік «Радастоўскі» — сапраўдны скарб лекавай і рэдкай флоры, унікальны рэзерват, дзе захоўваецца жывая прырода. На Драгічыншчыне працякае жывапісная рэчка Ясельда. Вандраваць можна па судаходным Днепра-Бугскім канале. Чыстыя і прыгожыя азёры Спароўскае і Белае ацэніць любы аматар прыроды. Унікальная вёска Какорыца нібы вяртае на старонкі рамана Івана Мележа «Палескія хронікі». Свае паслугі прапануюць гасцям 10 аграсядзіб.

На працягу стагоддзяў на Драгічыншчыне мірна суіснавалі прадстаўнікі самых розных этнічных груп. На тэрыторыі раёна захаваліся мясцовыя дыялекты, песні, легенды, абрады, промыслы, народныя традыцыі. Вялікай папулярнасцю карыстаецца народны музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок», дзе сабрана звыш 200 унікальных вытканых і вышытых фартухоў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

БРЭНД РАЁНА — «БЕЗДЗЕЖСКІ ФАРТУШОК»

Экскурсаводы, работнікі турфірмаў ды іншыя праважатыя па выбітных мясцінах Драгічыншчыны часта гавораць наведвальнікам, што аналагаў музея «Бездзежскі фартушок» няма ў краіне. Але іх, напэўна, няма і ў свеце, каб цэлы музей быў створаны ў гонар такой спецыфічнай дэталі жаночага строю, як фартух. І гэта зусім не той фартух, які мы накідваем на сябе, падыходзячы да пліты. Гэта частка касцюма, якая ўпрыгожвае яго, надае яму пэўную адметнасць. Бездзежскія фартушкі вышывалі асаблівым узорам. Каляровая гама, арнамент з маленькіх кветачак здольны ўзнімаць настрой і ўсяляць аптымізм. Ніводзін фартух не паўтарае другі.

Начальнік аддзела культуры Драгічынскага райвыканкама Леанід КУРОЎСКІ.

Нездарма на Міжнародным фестывалі па захаванні традыцый і развіцці народных рамёстваў у мінулым месяцы ў Ганцавічах каля экспазіцыі з Бездзежа асабліва тоўпіліся людзі з фотаапаратамі. Там усё было прыгожае, але бездзежскія фартушкі — нібы маладыя на вяселлі...

Музей даўно стаў гонарам раёна. У ім сабрана каля 300 фартухоў, выкананых рукамі бездзежскіх майстрых. За стварэнне калекцыі аўтэнтычных узораў народнай творчасці, за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю мясцовых рамёстваў, абрадаў і дыялектаў калектыву музея прысуджана прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2009 годзе.

За гэтыя грошы тут вырашылі абсталяваць цэлы турыстычны комплекс. Прыедзжы чалавек убачыць сялянскі дом у старым стылі, прадметы побыту палешука. Усё гэта, вядома, прыгожа афармяць вышываными ручнікамі, сурвэткамі, абрусамі. Тут жа запланавана адкрыць гасцінічныя нумары, нацыянальную кухню. Праўда, пачаставаць наведвальнікаў у музеі запрашаюць і зараз.

Як сказаў намеснік старшыні Драгічынскага райвыканкама Уладзімір Нерад, фактычна гатовы новы турысцкі маршрут. Яно і раней хапала ахвотных паглядзець унікальны музей — прыязджалі госці з бліжэйшых аграсядзіб. Але ж наспела патрэба аказваць больш паслуг вандроўнаму чалавеку. І найперш неабходна мець хоць маленькую сувенірную крамку. Вядома, рарытэтамі гандляваць ніхто не збіраецца. Іх супрацоўнікі музея самі набываюць у мясцовых жыхароў, якія захавалі фартухі сваіх бабуль у шафах ды куфрах. Для продажу ёсць сучасныя вырабы.

Вясковыя майстрыхі Марыя Міневіч, Надзея Янушчык, іншыя жанчыны і цяпер займаюцца ткацтвам. Таму ідэя навуковага супрацоўніка бездзежскага музея Галіны Філіповіч стварыць цэнтр рамёстваў пры музейным комплексе выглядае цалкам рэалістычнай. У памяшканні музея будуць стаяць ткацкія станкі, і любы турыст пад кіраўніцтвам майстра зможа выткаць сваімі рукамі невялікі сувенір і ўзяць яго на памяць. Некаторыя наведвальнікі, асабліва з краін Еўропы, дзе нічога падобнага даўно няма, дакладна, прыйдуць у захапленне ад такой магчымасці.

Яшчэ ў музеі могуць паказаць мясцовы абрад, дазволіць фотасесію наведвальніка ў нацыянальных касцюмах, якія тут прадстаўлены на ўсе сезоны. Можна, скажам, прыбрацца ў кажух, завязаць цёплую квяцістую хустку ды пакалыхаць плеценую калыску з лялькай. Каля старадаўняй лавы цікава будзе выглядаць і прывабная маладзіца ў летнім строі.

Галоўны захавальнік фондаў музея «Бездзежскі фартушок» Ніна ЯРМАЦ.

Іван ЮШКЕВІЧ і Алена ЛУКАШЧЫК — гаспадары сялянскай сядзібы пры музеі.

А калі завітаць у хату да старэйшых вяскоўцаў, гаспадары пакажуць цэлы скарб. Тут амаль у кожнага ёсць ручнікі, сарочкі і абавязкова фартушкі ад бабуль. Іх шанавалі, беражлі, перадавалі сакрэты вырабу. Бездзежскі фартушок асаблівы: каб хто ўзяўся рабіць яго, не ведаючы пэўных асаблівасцяў, у яго нічога не атрымалася б. Ручнікі таксама мелі свае рэцэпты і ўмовы. Лён збіралі ў строга вызначаныя тэрміны. Палатно адбельвалі па сваёй старадаўняй тэхналогіі, якую перадавалі ад бабулі да маці, ад маці да дачкі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ, Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ МЫ РАЗАМ — БЕЛАРУСЬ!

АД «ПАПАРАЦЬ-КВЕТКІ» ДА «КАЛЫХАНКІ» —

сіропы, бальзамы, вітамінныя дабаўкі, а таксама лякарствы на палескіх травах прапануе прадпрыемства «Экзон»

На «Экзоне» адказваюць за сваю прадукцыю і за тое, што пішуць на ўпакоўцы. Прадпрыемства ў Драгічыне было створана ў 1995 годзе. Спачатку там было паўсотні працаўнікоў, цяпер колькасць працуючых павялічылася да 220 чалавек. А зусім хутка на работу прыйдуць яшчэ каля 30 гараджан. Аб гэтым наша гутарка з дырэктарам ААТ «Экзон» Аляксандрам ШЫРКАЎЦОМ.

Дырэктар Аляксандр ШЫРКАВЕЦ.

— Чалавечы арганізм можна параўнаць з біяфабрыкай, — гаворыць Аляксандр Дзмітрыевіч. — Калі не хапае біялагічна актыўных рэчываў, ён можа даваць збоі. Ідэя падтрымкі функцый арганізма з дапамогай біялагічна актыўных дабавак — не новая. Так робяць у многіх краінах даўно. Каб выпускаць прэпараты, адаптаваныя да нашых умоў, зробленыя з выкарыстаннем сваёй сыравіны, і адкрывалася наша прадпрыемства. Зараз мы маем чатыры тэхналагічныя лініі вытворчасці — сіропаў, гематагену, сыпучых прэпаратаў, таблетак. Выпускаем 80 найменняў прадукцыі.

— Хто ваш спажывец?

— Абсалютная большасць прадукцыі прадаецца на ўнутраным рынку. Але жыццё падштурхоўвае да таго, што мы пачынаем актыўна асвойваць рынак знешні. Частку сыравіны даводзіцца купляць за валюту — значыць, яе трэба зарабіць. Таму сёння мы маем гандлёвых партнёраў у Латвіі, Літве, Германіі. Два гады таму паспрабавалі наладзіць пастаўкі ў ЗША — гэта была невялікая пробная партыя тавару. А цяпер яны ўжо замовілі ўпакоўку па-англійску і прыслалі заяўку на большую колькасць. Мы вярнулі рынак Малдовы, які быў некалькі гадоў таму страчаны. Былі пэўныя цяжкасці з гандлёвай працэдурай з Расіяй, але вырашэнню пытання паспрыяў Мытны саюз. У Казахстан таксама наладжаны прамыя пастаўкі. Паспяхова закончылася трохгадовая работа па выхадзе на ўкраінскі рынак.

— У якім кірунку развіваецца вытворчасць?

— Паколькі аб'ём экспарту прадукцыі расце, з'явілася патрэба ў павелічэнні вытворчых магутнасцяў. У 2010 годзе пачалася рэалізацыя інвестыцыйнага праекта, які дазволіць нам выйсці на новы ўзровень. Мы ўдзячны за падтрымку кіраўніцтву райвыканкама, якое ініцыявала перадачу нам ва ўласнасць будынка, дзе вышэйназваны праект і рэалізуецца. Справа ў тым, што былыя складскія памяшканні перасталі адпавядаць сучасным высокім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да фармакалагічнай вытворчасці. А дабіцца адпаведнасці ўсім параметрам падлогі, сцен, вентыляцыі ў старым памяшканні было нерэальна. Таму наспела патрэба ў новым памяшканні. Мы ўзялі крэдыт на рамонт і рэканструкцыю будынка, а гарантам па вяртанні крэдытных сродкаў зноў жа выступіў раённы выканаўчы камітэт. Асноўныя работы па рэалізацыі інвестпраекта завершаны, хутка прыступім да мадэрнізацыі дзеючай вытворчасці. У першую чаргу будзе ўдасканалена лінія вытворчасці гематагену.

— Кадраў хапае?

— На рабочыя спецыяльнасці запрашаем жыхароў райцэнтра. Таксама гэтым летам прыязджаюць на працу два спецыялісты — правізар пасля Віцебскага медуніверсітэта і маркетолаг, выпускнік Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта.

Апаратчык прыгатавання медыцынскіх мас і мазяў Віталь КУДРЫЦКІ.

Калі на «Экзон» упершыню прыехаў прадстаўнік расійскіх партнёраў, ён адразу папрасіў прынесці «Энергавіт» з тэрмінам прыдатнасці ў два гады, які быў выпушчаны якраз два гады таму. Адкрыў, паспрабаваў, упэўніўся, што плітка не сухая, не цвёрдая, і, мяркуючы па заключаным дагаворы на пастаўку, застаўся задаволены.

***

З даўніх часоў у народнай медыцыне выкарыстоўваліся адвары і настоі лекавых траў, якімі багатае беларускае Палессе. Адсюль узнікла ідэя распрацоўкі серыі сіропаў пад назвай **«Палессе»**. Гэты БАД змяшчае комплекс вадкіх экстрактаў лекавых траў, якія стымулююць імунітэт, умацоўваюць і абараняюць арганізм. Выпускаюцца сіропы з шыпшынай, рабінай, мятай, душыцай, рамонкам, чарнічамі, журавінай. Ёсць сіроп пад назвай **«Жаночы век»**, які рэкамендуецца для ўмацавання здароўя жанчын.

Ад супрацоўніцтва са Свята-Еліса-вецінскім мінскім манастыром атрымаўся цікавы праект. Манахі звярнуліся з прапановай выпускаць фітабальзамы на аснове 15 відаў лекавых траў. У іх асяродку таксама ёсць спецыялісты. Вось яны і прыехалі ў Драгічын, знаёміліся з вытворчасцю, выказвалі пажаданні. Тутэйшыя тэхнолагі ўважліва вывучылі іх прапановы, нешта скарэктавалі. У выніку агульнай працы зарэгістравана сем бальзамаў з серыі **«Манастырскі»**. Усе яны маюць прыгожыя беларускія назвы. Напрыклад, **«Папараць-кветка»**, **«Чароўная крыніца»**, **«Духмяны»**, **«Лясная казка»**. У аснову фітабальзаму **«Калыханка»** ўваходзяць меліса, валяр'яна, сардэчнік, якія валодаюць заспакаяльным дзеяннем. Таму яго рэкамендуюць пры стомленасці, раздражняльнасці. Бальзам спрыяе ўзнаўленню сіл пасля напружанай працы. Манастыр стаў не толькі рухавіком вытворчасці папулярнай біядабаўкі, але і аптовым пакупніком прадукцыі, што выгадна прадпрыемству.

У складанай экалагічнай сітуацыі асаблівую актуальнасць набывае гематаген, як дабаўка, багатая на жалеза, іншыя вітаміны, бо гематаген зараз выпускаецца з курагой, чарнаслівам, арахісам. Два гады таму асвоены выпуск новай біялагічнай дабаўкі **«Энергавіт»**. Гэта ірысны батончык з вітамінам С і з натуральнымі напаўнялънікамі ў выглядзе арэхаў, цукатаў, сухафруктаў. Прадукт ужо палюбілі айчынныя пакупнікі, ды і на знешнім рынку ён актыўна рэалізуецца. Аснову вытворчасці складае мясцовая сыравіна. Малако, цукар, вядома, свае, альбумін атрымліваюць з Бярозы, патаку — ад суседзяў з «Экзон-Глюкоза».

Адна з апошніх распрацовак — біялагічна актыўная дабаўка **«Апівіт»** на аснове прадуктаў пчалярства. У склад «Апівіту» ўваходзяць пропаліс, пчаліны пылок, натуральны мёд, вітамін С. Рэкамендуецца як дарослым, так і дзецям, найперш як сродак прафілактыкі прастудных, вірусных, інфекцыйных захворванняў, для паляпшэння памяці і ўвагі, для павышэння работаздольнасці. Біядабаўка **«Кальцынулін»** асабліва карысная дзецям і падлеткам у перыяд інтэнсіўнага росту, з поспехам прымяняецца хворым на цукровы дыябет і тымі, хто прытрымліваецца нізкакаларыйнай дыеты.

Усё большую папулярнасць набываюць лекавыя сродкі «Экзона». **Аскарбінавую кіслату**, пэўна, ведаюць усе. Яна прадаецца як у выглядзе парашку для прыгатавання растворaў, так і ў таблетках, гатовая да прымянення. Сіропы ад кашлю **«Алтэй»**, **«Трыпутнік»** — эфектыўныя прэпараты і даступныя па цане.

Французскі прэпарат **«Рэні»** вядомы многім. Яго прымяняюць пры парушэнні кіслотнасці ў страўнікавай сістэме, калі адчуваецца поўны дыскамфорт — пякотка, цяжкасць у вобласці страўніка, ваніты. Пазалетась на «Экзоне» выпусцілі айчынны аналаг пад назвай **«Рэнікзон»** з тым жа дзеяннем, але таннейшы ў два разы.

Вынікам цеснага супрацоўніцтва з індыйскай фірмай «Плетхіко» стаў **«Травісіл»** — комплексны раслінны прэпарат. Ён эфектыўны пры вострых і хранічных захворваннях органаў дыхання, а таксама пры кашлі курцоў. Эфектыўны «Травісіл» і пры хваробах горла. А ўсё таму, што ў склад уваходзіць 13 гаючых раслін. Выпускаецца прэпарат як з цукрам, так і без яго, у выглядзе сіропу і таблетак. А жавальныя таблеткі «Глюкоза» са смакам клубніц, лімона, вішні, трапічных фруктаў паказаны пры гепатытах, розных інтаксікацыях, а таксама пры недахопе вуглеводаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

Ідзе раскатка гематагеннай масы.

Упакоўку парашку аскарбінавай кіслаты (вітамін С) у тэрмаўсадачную плёнку праводзіць дазіроўшчыца Галіна ЗДАНОВІЧ.

УНП 200433278. Ліц. № 02040/193 от 20.04.2011 г. № 5.5, выдадзена Міністэрствам аховы здароўя РБ.

СВК «Імянінскі»: адчуваем, на што рабіць стаўку


Галоўны эканаміст гаспадаркі Сяргей ВЯЛЕСІК (другі справа) з трактарыстамі Іванам ЯРАШЭВІЧАМ, Аляксандрам САКОВІЧАМ, Сяргеем ХВЕДУНЦЭВІЧАМ.

Уладзімір СУХАРЭВІЧ, старшыня СВК «Імянінскі», скончыў Малінаўскую базавую школу ў Драгічынскім раёне, сельскагаспадарчы тэхнікум (аддзяленне аграноміі). Па завяршэнні службы ў арміі паспяхова скончыў сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках. Працаваў аграномам-лугаводам у калгасе «Рассвет» Драгічынскага раёна. Праз паўгода стаў галоўным аграномам, праз дзевяць гадоў — намеснікам старшыні. Чатыры гады быў намеснікам старшыні ў калгасе «Заказельскі». У 1997-м заняў пасаду старшыні калгаса «Радзіма», які перайменаваны ў 1990-я ў СВК «Імянінскі». Сёлета абараніў кандыдацкую дысертацыю.



СВК «Імянінскі», што ў вёсцы Імянін Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці, — адзін з паказальных. За апошнія гадоў дзесяць прадпрыемству ўдалося дабіцца эфектыўнасці і стабільнасці, нягледзячы на няпростыя эканамічныя ўмовы. Кіраўніцтва СВК адчувае перспектыўныя кірункі развіцця сельскай гаспадаркі і бярэцца за рэалізацыю смелых праектаў, якія праз нейкі час пацвярджаюць права на жыццё і патрабуюць далейшага развіцця. Так было, напрыклад, з ідэяй садаводства або насеннем кукурузы, а ў перспектыве, тут спадзяюцца, будзе і са сланечнікам. Да моманту, калі гэтыя кірункі сталі асновай для стварэння і зацвярджэння адпаведнай дзяржаўнай праграмы, гаспадарка «Імянінскі» ўжо мела пэўны вопыт такой работы.

СВОЙ СЛАНЕЧНІК

У СВК «Імянінскі» — звыш 4,5 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 1,5 тысячы — дойнага статка. Кожнае айчыннае жывёлагадоўчае прадпрыемства («Імянінскі» тут не выключэнне) адчувае праблему забеспячэння камбікармамі. Забеспячэнне жывёлы бялком з рапсу і сланечніку, вытворчасць уласнага бялку — тэма, якая хвалюе ўсіх аграрыяў-кіраўнікоў. Зразумела, што самым выйгрышным варыянтам можа быць развіццё ўласнай камбікормавай вытворчасці.

— Гэты год паказаў, што некаторым гаспадаркам давялося набываць камбікорм з кампанентаў імпартнага зерня, — расказвае **старшыня СВК «Імянінскі» Уладзімір СУХАРЭВІЧ.** — А каштаваў ён вялікіх грошай. Рэнтабельнасць у такіх выпадках нават на нуль не выходзіць... Высокі кошт камбікармоў, вядома, адбіваецца на кошце гатовай прадукцыі. Між тым, у нас ёсць прадуманая праграма дзеянняў, вядзенне гаспадаркі для атрымання ўласных кармоў, у тым ліку і бялковай сыравіны як асноўнага кампанента для вытворчасці камбікормавага канцэнтрату. Мы не набывалі сёлета ні кілаграма шроту па рыначным кошце, не патрацілі ніводнага рубля сродкаў на закупкі ў суседніх краінах. Гаспадарка мае ўласны бялок, які ў два разы танней. Эканомленыя грашовыя сродкі застаюцца ў раёне — а гэта не мае патрэбы ў тлумачэнні.

СВК днямі ўжо завяршыў уборку свірэпіцы і ячменю, зараз ідзе ўборка рапсу. Апошні займае 250 га і дае ўраджайнасць 25 ц/га. Гэта забяспечвае дзяржзаказ.

Вось ужо трынаццаць гадоў, як для СВК «Імянінскі» сваёй культурай стаў сланечнік. Гомельская і Брэсцкая вобласці займаюцца ім смела, мэтанакіравана і з добрым вынікам, паколькі гэта ўжо мае эканамічную абгрунтаванасць. Гэта досыць сур'ёзная работа ў кірунку імпартазамяшчэння. Пад гэтую культуру ў гаспадарцы адведзена каля 150 га. Пашыраць пасевы не плануецца, паколькі «Імянінскі» не мае намеру гандляваць гэтым насеннем. Але ёсць і другая прычына. Сланечнік лічыцца не лепшым папярэднікам для іншых культур. Вось рапс, напрыклад, — ідэальны папярэднік для той жа пшаніцы. А сланечнік, калі сказаць коратка, спрыяе ўзнікненню патагеннай мікрафлоры, якая можа знаходзіцца ў глебе да 5-7 гадоў. Так што 150 га — плошча аптымальная для вядзення сямейнага севазвароту, каб забяспечыць гаспадарку сваёй макухай і бялком. Атрымліваецца эквівалентны абмен: вытворчасць атрымлівае алей, гаспадарка — макуху, і праз прадукцыю жывёлагадоўлі — грашовую выручку.

Варта патлумачыць, што вырошчваць сланечнік на Беларусі неабходна. Набываць — даражэй, а зусім абысціся без яго не выпадае. Сланечнік і рапс істотна адрозніваюцца па сваім складзе. У рацыёне ж як птушак, свіней, так і буйной рагатай жывёлы павінны прысутнічаць розныя складнікі бялку. Рапс змяшчае патрэбныя хімічныя рэчывы, аднак даваць іх у высокай канцэнтрацыі нельга, паколькі гэта адмоўна ўплывае на рэпрадуктыўную функцыю, работу печані. Неабходныя пэўныя суадносіны. Умоўна кажучы, 10 працэнтаў патрэбнага жывёле бялку павінна быць рапсавага паходжання і 8 — сланечнікавага.

«Можна было б і прадаваць сланечнік, але я сцвярджаю, што прадаваць яго нявыгадна, — кажа старшыня. — З-за нізкіх цэн, устаноўленых у нас. Але ж і набываць таксама не выгадна. Так што паўднёва-заходняй частцы краіны, лічыце, пашанцавала. Іншыя гаспадаркі рэспублікі набываюць шрот расійскі і ўкраінскі. Так, па якасці ён адназначна лепшы, паколькі ў шэрагу абласцей Расіі і Украіны гэтая галіна вельмі і вельмі развіта. Там працуюць спецыяльныя заводы для экстракцыі алею, прымяняецца спецыяльнае абсталяванне для абрушвання насення, перад тым як запусціць яго пад прэс, і таму шрот атрымліваецца чысты, без клятчаткі. У нашых заводаў няма лініі абрушвання насення. Мы апрацоўваем насенне сланечніку на абсталяванні, разлічаным на рапс. І таму на выхадзе атрымліваецца больш клятчаткі. Гэта не гаворыць аб тым, што бялок няякасны. Па хімічным саставе ўкраінскі, расійскі і наш бялок нічым не адрозніваецца».

Загадчыца лабараторыі рэгуляцыі росту і развіцця раслін НПЦ НАН Беларусі па земляробстве, кандыдат сельскагаспадарчых навук Іна БРУЙ, галоўны аграном Уладзімір ДАЎГУНЕНКА з Уладзімірам СУХАРЭВІЧАМ.

МАЛАКО: ЯШЧЭ ТРАПІМ У ДЗЯРЖПРАГРАМУ

Уладзімір Аляксандравіч спецыяльна завёз карэспандэнтаў «Звязды» ў вёску Заніўе, дзе яшчэ чатыры гады таму можна было пабачыць паўразваленую ферму для дойнага статка, са старой сістэмай кармлення і ручной дойкай. Сёння тут няхай і не поўная механізацыя, але 95 працэнтаў тэхнічных працэсаў — механізаваныя. Малочны блок, два кароўнікі на 300 галоў, кармавая база з'явіліся дзякуючы ўласным сродкам.

— Мы не чакаем, пакуль нас і тут уціснуць у дзяржпраграму па развіцці малочнай вытворчасці, — удакладняе старшыня. — Мы гэтага дабіваемся! Можна было б весці размову і аб павелічэнні статка, аднак у нас не хапае памяшканняў. Таму ў бліжэйшай будучыні плануем будаўніцтва комплексу па вытворчасці малака на 900 галоў. Эканамічны крызіс, безумоўна, забяспечыў нам адтэрміноўку гэтых планаў... У любым выпадку не стаім на месцы. За кошт глыбокіх структурных змяненняў, праведзеных гаспадарчым спосабам, за апошнія сем гадоў з дзевяці невялікіх малочнатаварных фермаў пяць пачалі ўстойліва развівацца. На 20 працэнтаў павялічылася пагалоўе, а вытворчасць малака за гэтыя гады амаль падвоілася. Палепшыліся і якасныя паказчыкі. Сёння 90 працэнтаў малака, якое мы рэалізуем, — вышэйшага гатунку і гатунку «экстра». Рэалізацыя малака на ААТ «Савушкін прадукт» складае 114 працэнтаў да ўзроўню мінулага года — гэта 3565 т за першае паўгоддзе...

Васямнаццаты сезон працуе на ўборцы ўраджаю перадавы механізатар Мікалай ЛАПУТКО.

Сучасны зернесушыльны комплекс у гэтыя дні працуе на поўную магутнасць.

— Па ўборцы зерневых і падрыхтоўцы кармоў летась у нас было першае месца ў раёне, — расказвае **галоўны эканаміст СВК «Імянінскі» Сяргей ВЯЛЕСІК.** — У гэтым сезоне таксама ёсць добры старт. Завяршылі ўборку азімага ячменю, ураджайнасць — 71 ц/га. Падрыхтоўку кармоў па аб'ёмах пачалі крыху слабей, чым летась, але выйграем па якасці. Пачалі ўбіраць у ранні тэрмін, вытрымліваем патрэбную фазу, што дае зусім іншую колькасць бялку. А гэта адбіваецца на прадукцыйнасці жывёлы.

Закончылі падрыхтоўку сенажу — 7,5 тыс. т ужо ёсць. Нарыхтоўваем сена — каля 700 т ёсць з першых укосаў. Напярэдзе яшчэ два ўкосы, так што нагонім неабходную колькасць.

Зараз пры ўборачнай плошчы 1570 га скошана і абмалочана звыш 570 га зерня — гэта 36 працэнтаў уборачнай плошчы. Намалочана 3160 т зерня пры ўраджайнасці 55,2 ц/га. Мы выканалі дзяржзаказ па рапсе, піваварным ячмені і харчовым жыце.

ТУТ БУДЗЕ «ІНТЭНСІЎНЫ» САД

Пятнаццаць гадоў таму СВК заклаў сад. Раскарчаваў спачатку стары, на 60 га, — яму на той момант было гадоў пяцьдзясят. Высакаслы, здзічэлы... Разбілі новы сад, пасадзілі яблыні беларускіх і замежных гатункаў. Калі справа пайшла, «Імянінскі» трапіў у Дзяржаўную комплексную праграму развіцця бульбаводства, гароднінаводства і пладаводства на 2004-2010 гады, зацверджаную Саветам Міністраў. Згодна з праграмай, СВК атрымала сродкі на развіццё, у тым ліку на будаўніцтва гароднінасховішча. Для ўзвядзення такога аб'екта спатрэбілася каля двух гадоў. Сховішча для гародніны аснашчана кампрэсарна-ахалоджвальным абсталяваннем і рэгулюемым газавым асяроддзем.

— Сёлета нам трэба пасадзіць 16 га яблынь, — расказвае **намеснік старшыні СВК «Імянінскі» Любоў АЛЕКСЯЙЧУК.** — На закупку саджанцаў выдаткаваны грошы з бюджэту, згодна з дзяржпраграмай. Вось зараз займаемся наладкай сістэмы кропельнага арашэння.

Наогул наш праект носіць назву «Сад інтэнсіўнага тыпу з кропельным арашэннем». Адна яго частка прадугледжвае непасрэдна закладку, другая — кропельнае арашэнне. У садзе яшчэ шмат работы: трэба ж не проста пасадзіць саджанцы, але і падвесці да кожнага кропельную трубку, навязаць спецыяльны провад, які трымае дрэўцы... Дарэчы, гэтай работай я зараз займаюся. У бліжэйшы час мы яе завершым. Сад — унікальны, і нездарма ён называецца садам інтэнсіўнага тыпу: ён дае ўраджай на другі-трэці год пасадкі. Плады ёсць ужо зараз, але мы пакуль іх абрываем, бо нам патрэбна фарміраванне дрэва... Гэтыя нізкарослыя дрэўцы, дарэчы, не такія даўгавечныя. Жывуць усяго каля 15-20 гадоў...

Увесь сад «Імянінскага» займае 100 га, а ў бліжэйшыя два гады павялічыцца да 150. У садзе ёсць розныя гатункі. Ёсць рускія, але беларускіх усё ж больш, бо яны лепш адаптаваныя, устойлівыя і пладаносныя для тутэйшых «шырот». Штосьці здаецца на кансервавы завод, а гатункавы яблык адпраўляецца ў гандлёвыя сеткі Брэсцкай вобласці.

Кладаўшчыца Тамара ДРОЗД у памяшканні, адкуль ажыццяўляецца камп'ютарны кантроль захоўвання садавіны ў новым сховішчы.

Сучаснае сховішча чакае новага ўраджаю.

КУКУРУЗНАЕ НАСЕННЕ АЙЧЫННАГА ПАХОДЖАННЯ


Намеснік старшыні Любоў АЛЕКСЯЙЧУК.

Паступова адчулі і важнасць для эканомікі сельскай гаспадаркі развіцця нарыхтоўкі кукурузнага насення. Дванаццаць гадоў таму насенняводства кукурузы існавала ў краіне толькі ў адной гаспадарцы, якая набывала малдаўскае насенне і даказвала іншым паўднёва-заходнім гаспадаркам перспектыўнасць гэтай дзейнасці. І хоць імпартная кукуруза на той момант каштавала не надта дорага, тым не менш, шэраг гаспадарак, у тым ліку «Імянінскі», асцярожна пачалі атрымліваць першыя гібрыды.

«Спачатку я пабываў на Гомельшчыне, асабіста азнаёміўся з тым, як кукурузу вырошчваюць, убіраюць, сушаць, абрушваюць, калібруюць, і зразумеў, што гэта магчыма і ў маёй гаспадарцы, — кажа Уладзімір Сухарэвіч. — У рэшце рэшт мы атрымалі сваё насенне. Кукурузная тэма вельмі важная, ужо тры гады як яна пастаўлена на дзяржаўную аснову».

Шэраг гаспадарак Гомельшчыны і Брэстчыны трапілі ў праграму па імпартазамяшчэнні па насенні кукурузы. Аднак па першым часе ўсё аказалася не так проста. Вытворчыя магутнасці калібровачнага завода ў пасёлку Крынічны Гомельскай вобласці былі абмежаваны, завод ледзь спраўляўся абслугоўваць сваё, мясцовае, насенне, паколькі калі выгада стала відавочнай, то вялікая колькасць калгасаў кінулася ў гэтую справу. Так што частку першага ўраджаю «Імянінскаму» давялося нават адправіць на іншыя патрэбы. Летась жа СВК заняў другое месца ў вобласці па вытворчасці насення кукурузы. Наогул Гомельская і Брэсцкая вобласці зараз на сто працэнтаў забяспечваюць гаспадаркі рэспублікі ўласным насеннем кукурузы. Яшчэ літаральна дзесяць гадоў таму аб гэтым цяжка было марыць, а сёння завяршаецца будаўніцтва другой чаргі завода ў Івацэвічах па вытворчасці кукурузных гібрыдаў. Цалкам верагодна, што ў перспектыве гэтая культура стане экспартнай.

БУЛЬБУ... «З КОЛАЎ»

Вытворчасць бульбы, бульбянога насення таксама ажыццяўляецца паводле дзяржпраграмы. Праўда, і тут не абышлося без пэўных цяжкасцяў. Летась, напрыклад, цана на бульбу рэзка ўпала, насенне не было куды збываць, паколькі гаспадаркі рэзка страцілі цікавасць да яго. Таму частку ўраджаю давялося адправіць на корм жывёле. Нягледзячы на гэта, сёлета «Імянінскі» крыху пашырыў пасевы бульбы, набыў новыя гатункі айчыннай селекцыі і некаторыя замежныя гатункі (галандскія, напрыклад) — для нармальнай канкурэнцыі галіны. Плануецца больш шчыльна заняцца сяржняраннімі гатункамі. «Што да галандскіх гатункаў, то патрэбы ў рэкламе яны, вядома, не маюць, — удакладняе старшыня. — Аднак і нашы беларускія гатункі пры нармальным да іх стаўленні даюць вельмі высокую прадукцыйнасць. Гэта датычыцца таго ж «Скарбу», «Здабытку», «Лілеі», «Уладара».

Пад бульбай у гаспадарцы зараз 150 га, аднак істотна павялічваць гэтую плошчу вялікага сэнсу няма: стрымліваюць магчымасці для захоўвання. Сучаснае бульбасховішча, будаўніцтва якога завяршылася летась, разлічана не больш як на 2 тысячы тон. Бульбасховішча, дарэчы, адпавядае ўсім належным патрабаванням. З дапамогай камп'ютара можна не толькі прасушыць, забяспечыць аптымальную вентыляцыю, але і, напрыклад, задаць праграму «абуджэння» бульбы перад пасадкай. Справа гэтая нятанная, таму, не выключана, што ў нейкі год расходы на захоўванне могуць не апраўдаць сябе. Плошча на 2 тысячы тон, можа, і недастатковая, але вострай патрэбы ў другім бульбасховішчы пакуль няма. Яшчэ каля 500 т бульбы адпраўляецца на корм жывёле, а астатняе прадаецца, што называецца, «з колаў». У перспектыве ж адназначна давядзецца думаць і пра расшырэнне магчымасцяў захоўвання. Сёння ж браць крэдыт пад гэтую справу неразумна.

Старшы повар Галіна ГАРБАЧУК і кухонная работніца Таццяна ХВЕДУНЦЭВІЧ забяспечваюць тых, хто працуе на палях, гарачым харчаваннем.

АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

СВК «Імянінскі»: буйная рагатая жывёла, вытворчасць малака і мяса, зерне, гародніна, фрукты, зернебабовыя, лён, рапс, насенне сланечніку.

***Рэнтабельнасць гаспадаркі — 19 працэнтаў. Рэнтабельнасць малака — 32 працэнты, мяса — 4, раслінаводства — 23, зерневых — 12, цукровых буракоў — 21, бульбы — 9, рапсу — 44, пладоў — 52.**

***Ураджайнасць зерня — 50,6 ц/га, цукровых буракоў — 460 ц/га, бульбы — 300, рапсу — 15.**

На вуліцы галоўнай сядзібы. Будынак праваслаўнай царквы пабудаваны з дапамогай гаспадаркі.

Святлана БАРЫСЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 200098493

ХТО БУДУЕ ДРАГІЧЫНШЧЫНУ?

На драгічынскай зямлі сёння няма кутка, дзе б ні пакінулі стваральны след рабочыя і інжынерна-будаўнічыя работнікі дзяржаўнага ўнітарнага будаўнічага прадпрыемства «Драгічынскае ПМК-8». Калектыў пабудаваў, рэканструяваў і адрамантаваў сотні аб'ектаў Драгічыншчыны — гандлёвыя цэнтры, рамонтныя майстэрні, дзіцячыя садкі і школы, медустановы і спартыўныя збудаванні, комплекс для адкорму буйной рагатай жывёлы ў вёсцы Папінская, правёў капітальныя рамонты школы ў вёсцы Бездзеж і Дома культуры ў вёсцы Брашэвічы...

Начальнік Драгічынскай ПМК-8 Валерый ПЕДЗІЧ.

Прафесійны падыход

За апошнія гады прадпрыемства істотна пашырыла сферу сваёй дзейнасці і сёння выконвае звыш дваццаці відаў работ. Акрамя будаўніцтва будынкаў і інжынерных збудаванняў, калектыў займаецца землянымі і ізаляцыйнымі работамі, аўтобуснымі перавозкамі, эксплуатацыяй грузапад'ёмных кранаў і інш. У ПМК ёсць укамплектаваныя кваліфікаванымі рабочымі спецыялізаваныя сантэхнічныя аддзелачныя ўчасткі, а таксама падсобная вытворчасць, дзе выконваюцца сталярныя работы, выпускаецца бетон, сценавыя блокі, вырабы з бетону, гіпсу, цэменту.

Мяняліся назвы прадпрыемства, геаграфія і наменклатура работ, аднак заставалася галоўнае — прафесіяналізм і высокая адказнасць кожнага работніка за агульны вынік. Таму аб'екты, пабудаваныя ПМК-8, вылучаюцца надзейнасцю, а значыць, будуць служыць доўга. Калектыў досыць упэўнена пераадолеў цяжкасці першай паловы 90-х гадоў. Сёння ж назапашаны вытворчы вопыт, выкарыстанне прагрэсіўных будаўнічых тэхналогій, зладжанасць дзеянняў падраздзяленняў, высокая кваліфікацыя інжынерна-тэхнічных работнікаў дазваляюць няўхільна нарошчваць аб'ёмы, вытрымліваць канкурэнцыю на рынку профільных паслуг. ПМК якасна будуе аб'екты раённага, абласнога і рэспубліканскага прызначэння.

— Такія поліхлорвінілавыя трубы прызначаны для водаправода на новых будаўнічых аб'ектах, — тлумачыць цясляр Віктар ДУДКО.

Салідная гаспадарка

Горад Драгічын, вуліца Вызвалення, 1. Гэта месца прапіскі дзяржаўнага ўнітарнага будаўнічага прадпрыемства «Драгічынская ПМК-8» аб'яднання «Брэстаблсельбуд». На 7,5 га размясцілася салідная гаспадарка калоны — будынкі цэхаў і службаў, аўтапарк, у якім налічваецца звыш 50 адзінак тэхнікі. Дарэчы, з 2008 па 2010 год прадпрыемства ўзяло 4 млрд рублёў крэдыту на набыццё новай тэхнікі. Праўда, у цяперашніх умовах выплачваць крэдыт стала значна складаней, чым гэта было напачатку. Штомесяц даводзіцца вяртаць банку каля 400 млн.

Дом на 40 кватэр

Па вуліцы Шасэйнай, што на паўднёвым захадзе горада, кружком стаяць новыя цагляныя пяціпавярхоўкі. Чатыры з іх з'явіліся дзякуючы ПМК-8. Першая вырасла яшчэ два гады таму, а вось гэтая, № 64, на 40 кватэр, дзе зараз суцэльны шум-пыл, рыхтуецца да здачы. Наогул, Шасэйную ўпрыгожваюць пяць новых дамоў з, галоўным чынам, двух-, трохпакаёвымі кватэрамі, у тым ліку і прадугледжаным у іх сацыяльным жыллём.

Упарадкаванне прылеглай тэрыторыі — таксама задача работнікаў ПМК. Калі работы цалкам будуць завершаны, поўнасцю будзе даведзена да ладу і навакольная тэрыторыя. У выніку атрымаецца ўтульнае, прыгожае месца пражывання для многіх сем'яў. Аднак для таго, каб казка стала рэальнасцю, тут давялося шмат папрацаваць: замест гэтых роўных дарожак, па якіх мы цэлай брыгадай крочым да аб'екта, тут было... балота. Можна сабе ўявіць, колькі намаганняў давялося прыкласці, каб стварыць самы што ні на ёсць трывалы падмурак для ўзвядзення некалькіх пяціпавярховак!

— У нашай арганізацыі працуе каля 300 чалавек. Асноўная будспецыяльнасць — муляр. Ёсць аддзелачнікі, маляры, тынкоўшчыкі, сантэхнікі, — тлумачыць па дарозе да новабудоўлі **намеснік начальніка ДУП «Драгічынская ПМК-8» Аляксандр КЛІМЧУК.** — Мы толькі электрычнасцю не займаемся... Увядзенне ў эксплуатацыю 40-кватэрнага жылога дома, безумоўна, значная падзея гэтага года. Мы выканалі тут падрадных работ на суму каля 5,6 млрд рублёў. Узвядзенне такіх аб'ектаў — заўсёды сур'ёзны экзамен для ўсіх удзельнікаў будаўнічага працэсу. Цяпер можна смела сказаць, што экзамен з гонарам вытрыманы, спецыялісты яшчэ раз пацвердзілі самы высокі ўзровень выканання работы...

У першым пад'ездзе, які мы наведваем з экскурсіяй, кіпіць работа, ды так, што размаўляць немагчыма. Можна толькі аглядаць. Сапраўды, навасёлам засталося чакаць нядоўга. Паўсюль пастаўлены, як кажуць у народзе, жалезныя дзверы, ёсць ужо дзверы і ў тамбурах... Унутры кожнай кватэры — якасны ламінат, пафарбаваныя сцены, столь. Дарэчы, матэрыялы для апрацоўкі свайго жылля будучыя жыхары выбіралі самі (у межах, вядома, акрэсленых фінансавых магчымасцяў). Выбіралі, напрыклад, фарбу для сцен, плітку для ваннага пакоя і кухні. На момант нашага азнаямлення з аб'ектам былі ўсталяваны ўжо і пластыкавыя шклопакеты, і сантэхніка — ванна, унітаз, змеявік і інш. Устанаўліваюць адразу і газавыя катлы, з дапамогай якіх можна будзе рэгуляваць ацяпленне. Ёсць і лічыльнікі на ваду.

— Для працы з драўнінай існуе сучаснае высокапрадукцыйнае абсталяванне, — кажа цясляр Віктар СІМАНОВІЧ.

«Людзі сёння ўмеюць лічыць грошы, — тлумачыць **прараб Генадзь ЛЯШЭВІЧ.** — Рабіць рамонт нашымі сіламі атрымліваецца танней, чым самастойна. Больш за тое, мы даём пяць гадоў гарантыі! Таму, калі што не так па любым пункце — будзем выпраўляць усе недахопы. Людзі гэта разумеюць і не жадаюць лішніх клопатаў. Ім застанецца проста ўзяць ключы і прыйсці жыць».

На хвіліну мы адарвалі для фотаздымак дзвюх шаноўных работніц, якія займаюцца аддзелачнымі работамі, што называецца, усё жыццё. Любоў Антонаўна МАЛЫШКА яшчэ ў 1993 годзе прыйшла працаваць у аблсельбуд у Іванава, а восем гадоў таму яе разам з Надзеяй Васільеўнай СЯРБУН перавялі сюды, у Драгічын. Мы пажадалі шаноўным работніцам поспеху ў іх нялёгкай працы і... накіраваліся на новы аб'ект.

Домікі на вёсцы

ПМК-8, як і раней, будуе аднакватэрныя домікі на вёсцы. Так, у вёсцы Осаўцы нас азнаёмілі з будаўніцтвам трох аднакватэрных жылых дамоў для супрацоўнікаў СВК «Асавецкі». Дамы, зразумела, невялічкія, але цагляныя. У хуткім часе будзем крыць дах, кажуць работнікі на аб'екце, затым застануцца аддзелачныя работы і прыбіранне навакольнай тэрыторыі. Дамы пад ключ будуць здадзены ў кастрычніку.

На гэты год ПМК плануе ўвесці 10 аднакватэрных жылых дамоў у сельскагаспадарчых арганізацыях. З вышэйзгаданых дамоў уведзены ў будаўніцтва тры жылыя дамы агульнай плошчай каля 232 кв. м.

Для малочнай вытворчасці

Наступны аб'ект — больш вялікі па тэрыторыі і маштабе работ. У вёсцы Вулька-Папінская генпадрадчык СВК «Пенякова» узводзіць малочнатаварную ферму. ПМК-8 выконвае на маштабным аб'екце шэраг работ — мантаж самога будынка фермы, кладку сцен, узвядзенне даху, а таксама зямельныя работы.

У момант нашага візіту на аб'екце працавала брыгада муляраў і прараб Рыгор МАСЮК. Некалькі чалавек клалі сцены. Сам жа «каркас» будучай фермы змантіраваны яшчэ ў маі.

З нядаўна завершаных буйных будоўляў у раёне мы наведалі малочнатаварны комплекс СВК «Асавецкі». СВК займаецца малочнай вытворчасцю. Для гэтых мэт кааператыву спатрэбіліся некалькі кароўнікаў, сянажныя ямы, тэхнічныя памяшканні для нарыхтоўкі і захоўвання малака і некаторыя іншыя памяшканні. ПМК-8 зрабіла тут фактычна ўсё — ад агароджы да дарогі. Комплекс быў здадзены яшчэ ў 2009 годзе.

— Аб'ём падрадных работ, выкананых уласнымі сіламі за першае паўгоддзе па малочнатаварных фермах і комплексах, склаў 3766 млн рублёў, па генпадрадзе — 3818 млн, — кажа Аляксандр Клімчук. — Па рэканструкцыі малочнатаварнай фермы ў вёсцы Папінская за першае паўгоддзе мы выканалі работ на 1498 млн рублёў, па рэканструкцыі малочнатаварнай фермы ў вёсцы Семяновічы Уздзенскага раёна — на 999 млн рублёў, рэканструкцыі малочнатаварнай фермы ў вёсцы Сарацні — на 679 млн...

Брыгадзір Арарат ГУКАСЯН і муляр Ігар ЧЫЖЭЎСКІ ў гэтыя дні працуюць на ўзвядзенні сельскагаспадарчых аб'ектаў.

Штомесяц з прыбыткам

Работнікі ПМК-8 прыцягваюцца і на аб'екты ў іншых населеных пунктах. Так, гэтымі днямі яны бяруць удзел у ажыццяўленні аддзелачных работ у інтэрнаце на 860 месцаў для сельгасакадэміі, што ў горадзе Горкі.

Сёння ёсць пэўныя цяжкасці з належнай колькасцю будматэрыялаў. Як вядома, ліпень-жнівень — самая гарачая пара для вытворцаў цэменту. Усё, што імі вырабляецца, адразу разбіраецца. Запасу, як правіла, няма.

Ёсць пэўныя праблемы з кадрамі. Моладзь даволі цяжка прыцягнуць у працоўныя спецыяльнасці. Акрамя таго, як толькі прыходзіць адчуванне, што ты дасягнуў добрага прафесійнага ўзроўню, узнікае жаданне шукаць большы заробак.

— Аднак нам удаецца неяк балансаваць і трымаць планку, — дзеліцца **начальнік ДУП «Драгічынская ПМК-8» Валерый ПЕДЗІЧ.** — Стараемся выходзіць з прыбыткам — і па выніках паўгоддзя, і штомесяц. Сёлета запланавана выкананне аб'ёму падрадных работ уласнымі сіламі на 37 млрд рублёў. Па выніках першай паловы года мы выканалі аб'ём падрадных работ амаль на 22 млрд рублёў, што складае 131 працэнт да ўзроўню мінулага года, а да плана ў бягучых цэнах — 106 працэнтаў. Агульнае выкананне па жыллі склала 11 639 млн рублёў, па жыллі на вёсцы — 3 141 млн. Выканалі ўласнымі сіламі па жыллі — на 10 600 млн рублёў, па жыллі на вёсцы — 3 070 млн рублёў...

У цяперашняй сітуацыі складаней стала абнаўляць асноўныя сродкі прадпрыемства. У пэўным сэнсе выручыла папярэдняя пяцігодка, на працягу якой працэнт зношанасці асноўных сродкаў удалося знізіць амаль на 30 працэнтаў да ўзроўню 2005 года. Каэфіцыент зносу складаў у першым кварталe гэтага года 49 працэнтаў, у 2005-м — 77,5. Агульная сума інвестыцый склала за першае паўгоддзе ўсяго 31 млн рублёў, што складае няпоўныя 30 працэнтаў да ўзроўню мінулага года.

Святлана БАРЫСЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

УНП 200098608

Па вуліцы Шасэйнай, што на паўднёвым захадзе горада, кружком стаяць новыя цагляныя пяціпавярхоўкі.

Якасна працуюць вопытныя аддзелачніцы Любоў МАЛЫШКА і Надзея СЯРБУН.

Плот — рэч нескладаная, але і гэтую прадукцыю вырабляюць такія вопытныя цесляры, як Мікалай ПАЙ і Андрэй ШУБІН.

Чарговыя заданні абмяркоўваюць прараб Рыгор МАСЮК і начальнік вытворчага аддзела Віктар ЦЕРАШКОВІЧ.

З 40-гадовым стажам

Начальнік падсобнай вытворчасці, старшыня прафкама Васіль Якаўлевіч ЯКУТА працуе на ПМК-8 вось ужо амаль 40 гадоў.

— Я прыйшоў сюды ў 1973 годзе, адразу пасля заканчэння тэхнікума. У наступным годзе, 20 сакавіка, будзе акурат 40 гадоў як я пачаў тут працаваць... Пачынаў з дыспетчара, працаваў майстрам на лініі, пасля ў вытворчым аддзеле, быў начальнікам падсобнай вытворчасці. Быў і сакратаром камсамольскай арганізацыі, затым партарганізацыі, а з 1991 года і па цяперашні момант з'яўляюся старшынёй прафсаюзнага камітэта. Калі ўзнікаюць нейкія рабочыя пытанні, мы іх з наймальнікам вырашаем. Калектыў у нас, праўда, значна скараціўся за апошнія паўгода, але ж асноўныя паказчыкі мы выконваем.



Жылыя дамы ўзводзяць будаўнікі ПМК-8 у вёсцы Осаўцы для СВК "Асавецкі". На даху аднаго з іх мы сфатаграфавалі бетоншчыка Генадзя ЯКУША.

ДРАГІЧЫНСКАЯ ПМК-8 АЖЫЦЦЯЎЛЯЕ:

— будаўніцтва будынкаў;
— будаўніцтва інжынерных збудаванняў;
— любыя будаўнічыя работы, якія патрабуюць спецыяльных прафесій;
— вытворчасць сталярных вырабаў;
— вытворчасць сценавых блокаў;
— вытворчасць таварнага бетону і сухіх бетонных сумесяў;
— разборка і знос будынкаў;
— земляныя работы;
— санітарна-тэхнічныя работы;
— тынкавальныя работы;
— вытворчасць вырабаў з бетону, гіпсу, цэменту;
— ізаляцыйныя работы;
— установка іншага ізаляцыйнага абсталявання;
— пакрыццё падлогі і абліцоўка сцен;
— любыя аддзелачныя работы;
— арганізацыя перавозак;
— эксплуатацыя грузапад'ёмных кранаў;
— сталярныя і цяслярныя работы;
— малярныя і шкляныя работы.

Малочнатаварная ферма СВК «Асавецкі» пабудавана калектывам ПМК-8.

У вёсцы Вулька-Папінская генпадрадчык СВК «Пенякова» узводзіць малочнатаварную ферму.

БЫЦЬ КЛАПАТЛІВЫМ ГАСПАДАРОМ

Дырэктар ЖКГ Аляксандр МАКУХА.

КАМФОРТ У ДАМАХ, ПАРАДАК НА ВУЛІЦЫ

Што такое прадпрыемства ЖКГ для маленькага райцэнтра? Гэта штодзённае жыццё чалавека. Чаму? Таму што найпершая наша патрэба — вада. Водазабеспячэнне насельніцтва, а таксама водаадвядзенне, ацяпленне дамоў і сацыяльных аб'ектаў, абслугоўванне жылля, ачыстка, прыбіранне вуліц, добраўпарадкаванне, а яшчэ лазні, гасцініца, нават кветкі куплю для ўласнага падворка, дачы, кватэры можна тут. Ну і з самай сумнай нагоды гараджанін альбо вясковец звяртаецца ў рытуальную службу ЖКГ. Таму работнікі іншыя карыстальнікі паслуг нярэдка крытыкуюць службу, скардзяцца ў розныя інстанцыі. І ў такіх стасунках выпрацоўваецца агульнае разуменне. Бывае, даводзіцца цярпліва тлумачыць, тым самым павышаючы прававую граматнасць і культуру грамадзян. А на астатнія скаргі адказам можа быць толькі ўдасканаленне сваёй работы.

Вось ужо 26 гадоў Драгічынскую жыллёва-камунальную гаспадарку ўзначальвае Аляксандр МАКУХА. Мяняліся назвы прадпрыемства, а сутнасць заставалася — штодзень забяспечваць нармальную якасць жыцця насельнікам горада і раёна. Аляксандр Андрэевіч згадаў год, калі запасу мазуту ў кацельні заставалася на суткі. На двары — студзень, мароз трашчыць. Паліва эканомілі, ужывалі мінімальна — каб толькі падтрымаць стан кацельнай гаспадаркі, паколькі выхад яе са строю азначаў бы амаль катастрофу ацяпляльнай сістэмы. Пакуль — Намнога лягчэй стала працаваць, калі нам падвялі газ, — пачаў свой расказ Аляксандр Андрэевіч. — Цяпер кожную зіму гарантавана цяпло ў кватэрах. А цяпло, самі ведаеце, не толькі здароўе, камфорт, але і настрой чалавека дома, на працы, у грамадскім месцы. Цеплазабеспячэнне, як і падача вады, — галоўныя, так бы мовіць, стратэгічныя кірункі дзейнасці нашай арганізацыі. Але і іншыя не выглядаюць другаснымі. Дабрабыт людзей з кожным годам павышаецца, растуць іх патрабаванні да ўсіх службаў жыццезабеспячэння. Па рэалізацыі апошняга і працуе наш вялікі калектыў.

— Калі ласка, скажыце колькі слоў аб структуры свайго прадпрыемства...

— Структура жыллёва-камунальнай гаспадаркі даволі складаная. У свой час, калі я прыйшоў сюды на працу, вельмі здзівіўся таму, што ёсць столькі рахункаў у банку. На камбікормавым заводзе, дзе раней працаваў, быў адзін рахунак. Потым стала зразумела: на камунальныя паслугі датацыі дае дзяржава з бюджэтных сродкаў. Таму на капітальны рамонт заведзены адзін рахунак, на бягучы — другі. Адны мерапрыемствы фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, другія — з абласнога. Адсюль і складаная бухгалтэрыя.

Нават колькасць працаўнікоў на прадпрыемстве ў нас непастаянная: летам працуе 600 чалавек, у ацяпляльны сезон набіраем яшчэ прыкладна сотню. Цяплом горад і раён забяспечваюць 29 кацельняў, пяць з якіх працуюць на газавым паліве і 24 — на дровах.

Усяго ў склад Драгічынскай ЖКГ уваходзіць дзесяць структурных падраздзяленняў. Іх, напэўна, варта пералічыць: водазабеспячэнне, водаадвядзенне, кацельная гаспадарка, абслугоўванне жыллёвага фонду, санітарная ачыстка, лазневае абслугоўванне, рытуальнае абслугоўванне, участак дапаможнай вытворчасці, участак добраўпарадкавання, участак капітальнага рамонту і будаўніцтва. Нават па пераліку відаць, якая гэта разнастайная і складаная гаспадарка. І ўсё павінна функцыянаваць.

Прафесіяналы сваёй справы — юрысконсульт Таццяна СНАРСКАЯ, інжынер-праграміст Аляксандр ЛАЎРЫНОВІЧ, інспектары па кадрах Людміла КУЧЫК і Інара ВАЙТОВІЧ.

Галоўны бухгалтар Ала ШКІЛЮК (другая справа) з калектывам бухгалтэрыі.

Возьмем да прыкладу адно з такіх надзённых пытанняў, як санітарная ачыстка населеных пунктаў. У нас у раёне іх 128, з кожнага рэгулярна вывозім смецце. Тэхнікі малавата, таму графікі яе работы складзены вельмі шчыльна. Але ўсюды паспяваем, ніводная вёска не застаецца па-за ўвагай. Раней былі вызначаны гадзіны, калі жыхары выносілі вёдры і мяхі з бытавымі адходамі. Цяпер для зручнасці людзей усталяваны іншы парадак, гаспадар выстаўляе каля дарогі ёмістасць са смеццем у зручны для сябе час. А машына падыходзіць і забірае.

— Насельніцтва прывыкла аплачваць гэтыя паслугі, няма асаблівых праблем у гэтым сэнсе?

— У асноўным разлік ідзе своечасова ў горадзе, на сяле таксама сельсаветы праводзяць арганізацыйную работу. Але варта заўважыць: насельніцтва аплачвае кошт часткі паслугі па вывазе смецця, на астатняе паступае датацыя дзяржавы. Калі ўжо зайшла гаворка пра аплату, то хачу лішні раз напомніць чытачу, што вада ў кранах нашых кватэр практычна бясплатная. Давайце параўнаем: бутэлечку мінеральнай вады мы купляем у краме за 2500 рублёў, а кубаметр вады, што спажываем у кватэры каштуе нам 510 рублёў. Каментарыі, як кажуць, залішнія...

— На вашым балансе знаходзіцца вялікі жыллёвы фонд?

— У зоне абслугоўвання ўчастка жыллёвага фонду 172 пабудовы, з іх 133 размешчаны ў горадзе, 32 — у гарадскім пасёлку Антопаль, 5 — у вёсках, адзін шматпавярховы будынак інтэрната. Жыллё круглы год падтрымліваем у належным стане. Займаемся капітальным рамонтам, а таксама вядзём тлумачальную работу сярод жыльцоў. Ёсць такая патрэба, бо асабліва ў старых дамах умоваў захавання цяпла ў сезон з'яўляюцца добрыя вокны. Рады, што нарэшце ўдалося зрушыць свядомасць людзей. Жыльцы паступова мяняюць вокны на сучасныя шклопакеты.

— Наколькі рэнтабельна выглядае лазневая гаспадарка?

— Яна зусім не рэнтабельная, бо сродкі ад аплаты паслугі пакрываюць затраты прыкладна на трэць. Часткова страты кампенсуе бюджэт. Але мы цудоўна разумеем, што лазня — сацыяльна значны аб'ект, яго не закрыеш па прычыне стратнасці. Таму ўсе 18 лазняў раёна прымаюць наведвальнікаў.

— Ці распачалі вы падрыхтоўку да зімы, да новага ацяпляльнага сезона?

— Наша падрыхтоўка азначае перш за ўсё нарыхтоўку дроў. Гэта мы робім сваімі сіламі. З запланаваных 10 тысяч кубаметраў дроў на гэты год зараз маем шэсць тысяч «кубоў». Да пачатку ацяпляльнага сезона дровы будуць вывезены, парэзаны, здробнены, складзены ў падсобных памяшканнях з тым, што аператару кацельні застанецца толькі ўзяць паліва і закінуць у топку.

Сёлета завяршаем капітальны рамонт дзвюх кацельняў. І гэта будуць астатнія аб'екты кацельнай гаспадаркі, што прыведзены ў парадак. Іншыя рамантавалі яшчэ раней.

— Якія сродкі і сілы ўкладваюцца ў добраўпарадкаванне райцэнтра, іншых населеных пунктаў?

— Летась на добраўпарадкаванне пайшло каля чатырох мільярдаў рублёў. Прыемна, што ўдалося прывесці ў парадак мясціну, якую раней у горадзе называлі бальнічным садам. Тут вечна стаялі лужыны, пасля дажджу людзям прайсці было цяжка. Цяпер выкладзена плітка пешаходная дарожка 3-метровай шырыні. Пасаджаны сквер з 380 ліп. Для сквера ў Мінску спецыяльна заказалі восем прыгожых лавачак, вось-вось іх павінны падвезці. Побач паставім смеццевыя урны. Ужо ўстаноўлены ліхтары. Адным словам, былая пустка на вачах ператвараецца ў зону адпачынку. На гэта патрачана каля 400 мільёнаў рублёў.

Зараз вядзём капітальны рамонт вуліцы Кастрычніцкай. Туды нарэшце прыйдзе асфальтавае пакрыццё, будзе пакладзены тратуар. Каля 500 мільёнаў рублёў плануецца асвоіць на паляпшэнне Кастрычніцкай.

Прыемна, калі гараджане адзначаюць, што ў райцэнтры стала шмат кветак. Калі б вы прыехалі крыху раней, калі ў нас цвітуць цюльпаны, убачылі б, што горад літаральна пераўтвараецца. Асабліва прыгожа на плошчы: ураджанне, што цэлае мора рознакаляровых цюльпанаў хвалюецца ад павеву ветру. Пасля зімы гэта стварае асабліва ўзнёслы настрой. Цюльпанаў мы купілі некалькі гатункаў. І ўжо два гады запар увесну ўпрыгожваем горад.

У справе азелянення практыкуем малыя архітэктурныя формы. У шэрагу месцаў устанаўліваем стойкі з кветкавымі гаршкамі. Шмат кветак высаджваем у грунт. Упрыгожваем вуліцы дэкаратыўнымі кустамі. Цяпер гэта стала рабіць прасцей, бо ёсць свая цяпліца для вырошчвання расады і кветак. Яшчэ ўчастак добраўпарадкавання мае 11 касілак для абкошвання дарог, падтрымання зялёных зон у належным стане. Абкошваннем займаецца 14 чалавек. Асабліва гэтым летам, калі многа ападкаў, трава расце хутка, таму работы шмат. Але спраўляемся, асаблівых нараканняў з гэтай нагоды няма.

— А чаму не хваліцеся тым, што ўжо некалькі гадоў запар па выніках абласнога агляду-конкурсу санітарнага стану і добраўпарадкавання Драгічын мае прызавыя месцы?

— Што ёсць, тое ёсць. А не хвалімся таму, што не ўсё ўдаецца зрабіць, як хацелася б. Магчыма, ёсць месцы на ўскраінах горада, дзе людзі жадалі б бачыць больш нашага ўдзелу ў справе добраўпарадкавання. Ды не ўсё можна ахапіць адразу. І ўсё ж пры кожным выпадку стараюся даводзіць гараджанам, што год ад году наш невялікі ўтульны райцэнтр будзе прыгажэць. Усё для гэтага ёсць. А калектыў наш працуе стабільна, даўгоў няма, прыбытак хоць невялікі, але ў канцы года маем. Большасць працаўнікоў — добрасумленныя, адказныя людзі. Цякучасць кадраў у нас мінімальная. І хоць сярэдняя зарплата па арганізацыі не вельмі высокая, стараемся падтрымліваць людзей рознымі надбаўкамі, сацыяльнымі гарантыямі.

Набыткам можна лічыць той факт, што за апошнія гады кардынальна абноўлены тэхнічны парк. Параўнальна нядаўна куплены два трактары, два экскаватары, спецмашына МАЗ, кран. Яшчэ раней абнавілі парк смецця-возаў. Усё гэта служыць гарантыяй стабільнай работы.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

УНП 200070749

Уладкаванне водаадводаў абмяркоўваюць майстар Уладзімір ЛАКУЦ, Мікалай БАЦУК і Уладзімір НЯСЦЮК.

ЦЯПЛО І ГАРАЧАЯ ВАДА ДЛЯ ГОРАДА

Аператар кацельні Дзмітрый ІЎКОВІЧ.

На цэнтральнай кацельні поўны парадак. Старшы майстар Валерый МАГЕР з аператарам Дзмітрыем Іўковічам абмяркоўвалі нейкую тэхнічную праблему, калі мы падышлі і спыталі дазволу глянуць на іх складаную гаспадарку. Мужчыны аказаліся нешматслоўнымі. Яно і зразумела: іх работа — забяспечваць дзейнасць магутных агрэгатаў, якія даюць цяпло ў большасць жылога сектара горада, а таксама ў школы, медыцынскія ўстановы і падтрымліваць іх у тэхнічна спраўным стане. Па ацяпленні вытрымліваюцца неабходныя стандарты, гарачая вада падаецца спажыўцам кожны дзень. Гэта значыць, кацельная гаспадарка сваю работу выконвае на ўзроўні.

Старшы майстар цэнтральнай кацельні Валерый МАГЕР і намеснік дырэктара ЖКГ па ідэалогіі Юрый ЛІТВІНАЎ.

Такую прыгажосць вырошчваюць Валянціна ЦЕРАШКЕВІЧ і Галіна КАТАШУК.

КАБ ВАДА БЫЛА ЧЫСТАЙ

Загадчыца лабараторыі Ларыса БАЗАНЧУК (справа) з лабарантамі хіманалізу Алесяй ХІЛЬКО і Святланай КРУК, інжынерам-хімікам Тамарай СТАНКЕВІЧ і лабарантам Аленай ХВЯСЮК.

На водазаборы «Белянок» адно з галоўных падраздзяленняў — лабараторыя. Яе загадчыца Ларыса БАЗАНЧУК расказвае, як два разы ў суткі лабаранты вывучаюць склад паднятай з артэзіянскіх свідравін вады. Вывучаецца ўтрыманне жалеза, бактэрыяльны склад, іншыя паказчыкі спажывецкіх якасцяў. Кожную свідравіну правяраюць па 17 параметрах. Калі ж выяўляюцца нейкія агрэхі хоць бы па адным паказчыку, інжынер-тэхнолаг і начальнік цэха прымаюць рашэнне наконт мер па ачыстцы, хларыраванні вады.

Майстар водазабора Аляксандр РАДЗІВАНЮК.

Паводле слоў майстра Аляксандра РАДЗІВАНЮКА, работа водазабора арганізавана кругласутачна. У кожнай змене ёсць электраманцёр, машыніст станцыі, аператар па фільтраванні. Штодзень з нетраў зямлі тут падымаецца каля дзвюх тысяч кубічных метраў вады.

А ўсяго на балансе ЖКГ знаходзіцца 50 артэзіянскіх свідравін, 177 кіламетраў водаправодных сетак, ачышчальныя збудаванні, каналізацыйныя сеткі, 16 палёў фільтрацыі.

РОЗНАКАЛЯРОВЫ «ГІДРАМЕТЦЭНТР»

Майстар па азеляненні Людміла ТАНКЕВІЧ.

Майстар па азеляненні Людміла ТАНКЕВІЧ запрасіла паглядзець сваю стракатую гаспадарку. Ад такой прыгажосці вочы разбягаюцца, калі на невялікай плошчы цвітуць рознакаляровыя краскі. Але ўсе пахі квітнеючага дывана перабіваў адзін, нечым падобны на пах гваздзік. Паколькі паблізу такой кветкі не было, давялося спытаць пра гэта ў Людмілы Уладзіміраўны.

— Не, гэта петунія так пахне перад дажджом.

— А што, будзе дождж?

— Вядома, — упэўнена адказала прафесійны кветкавод.

І праўда, не прайшло і паўгадзіны, як пачаўся лівень. Аказалася, што асобныя кветкі не толькі моцна пахнуць, але нават «плачуць» перад дажджом. Так што працаўніцы ўчастка азеляненне прагнозаў па радыё не слухаюць. Яны глядзяць на свае расліны.

А работы па ўпрыгажэнні горада ў іх надзвычай многа. Трэба высаджваць на клумбах сальвію, бархатцы, іншыя кветкі і дэкаратыўныя расліны. У гаршках падрос малы кіпарыс (правільная яго назва — «кохія»). Гэтая расліна цікавая тым, што увесь час яна зялёная, а пад восень набывае барвовую афарбоўку.

У цяпліцы вырошчваюць і кветкі, і расаду, і прадукцыю ў гаршках, якой хапае на добраўпарадкаванне горада, а таксама на продаж насельніцтву. Зялёны тавар замаўляюць сельсаветы, арганізацыі горада і раёна, а таксама камунальныя прадпрыемствы іншых раёнаў. Апошнім часам з'явілася магчымасць рэалізоўваць прадукцыю і за межы раёна.

Калі прайсціся па Драгічыне, то можна заўважыць шмат клумбаў рознай формы і расфарбоўкі, абсаджаны кветкамі помнікі і памятныя месцы, упрыгожаны цэлыя вуліцы. За ўсім гэтым — карпатлівая праца жанчын-кветкаводаў.

Прыгажосць у горадзе ствараецца і рукамі кветкаводаў — Надзеі ДАВІДОВІЧ, Валянціны ЛЕБЕДЗЕВАЙ, Ірыны МАЛЫШЫЦ і Лідзіі ЖЫЛІНСКАЙ.

ГАЛЕРЭЯ КУБКАЎ ЯК ПАКАЗЧЫК СПАРТЫЎНЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

Увагу кожнага наведвальніка цэнтральнага офіса Драгічынскай ЖКГ, вядома ж, прыцягне цэлая галерэя кубкаў-узнагарод за спартыўныя дасягненні калектыву. А калектыў тут сапраўды спартыўны, калі мае столькі адзнак. Практычна кожная спартакіяда ў раёне і кожнае галіновае спаборніцтва ў вобласці ці рэспубліцы прыносіць папаўненне ў скарбонку ўзнагарод. Аб гэтым не без гонару расказаў інструктар па фізкультуры і спорце Уладзімір ЯКУШ. Уладзімір Уладзіміравіч працуе ў арганізацыі 14 гадоў, таму не дзіва, што ён выхаваў цэлыя каманды па асобных відах спорту.

Прадпрыемства мае сваю трэнажорную залу, дзе ў вольны час займаюцца працаўнікі. Апошнім часам паявілася магчымасць таксама аказваць платныя паслугі па аздараўленні, таму гэтую залу наведваюць і гараджане.

Інструктар па спорце Уладзімір ЯКУШ.

■ Абітурыент-2012

ЯК НЕ СТАЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАМ ВЫПАДКОВАГА ПРОФІЛЮ?

Сёння пры той шматстайнасці прафесій, якія прапануюць навучальныя ўстановы, маладым людзям, якія толькі стаяць на парозе дарослага жыцця, даволі праблематычна не разгубіцца. У якую навучальную ўстанову накіравацца? Якую прафесію выбраць? Дзе ў поўнай ступені рэалізаваць свой патэнцыял? Адказы на гэтыя пытанні будуць шукаць да канца лета дзясяткі тысяч выпускнікоў базавай і сярэдняй школы...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Міністр адукацыі Сяргей Маскевіч лічыць, што адна з задач школы заключаецца якраз у тым, каб навучыць дзяцей, асабліва старшакласнікаў, адэкватнай самаацэнцы. Тым больш што прафесійны выбар кожнага вучня з'яўляецца жыццёва важным не толькі для яго асабіста... Але, на жаль, далёка не ўсе выпускнікі асэнсавана падыходзяць да выбару прафесіі. Нярэдка выбар прафесіі здзяйсняецца пад уплывам бацькоў, сяброўскіх парад, «моды» на тую ці іншую прафесію, не падмацаванай пры гэтым рэальнымі патрэбамі рынку працы. Больш за тое, дзякуючы дэмаграфічнай сітуацыі ў нашай краіне стаць студэнтам ВНУ становіцца ўсё прасцей з кожным годам. Ці не таму кожны год з беларускіх ВНУ адлічваюцца да 15 тысяч студэнтаў? У Беларусі прыкладна трэцяя частка тых, хто атрымаў вышэйшую адукацыю, працуе не па сваёй спецыяльнасці ў іншых сферах. Але ў Міністэрстве адукацыі не схільны гэту сітуацыю драматызаваць.

— Можна, безумоўна, істотна павысіць прахадны бал на ўваходзе ў ВНУ, але ёсць і іншыя варыянты — абітурыенту даецца магчымасць сябе праявіць. І нават калі ты паступіў у ВНУ з невысокімі баламі, але жадаеш навучацца, то, калі ласка, працуй, — тлумачыць сваё бачанне сітуацыі першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК.— У той жа Германіі ва ўніверсітэтах да выпуску даходзіць толькі трэцяя частка з тых, хто туды паступіў. Напрыклад, на машынабудаўнічым факультэце Рэйнска-Вестфальскага тэхнічнага ўніверсітэта горада Ахена (гэта элітная тэхнічная ВНУ) пры наборы 1670 чалавек да выпуску дайшло ўсяго 542. Навучацца там і сапраўды цяжка, таму 30 працэнтаў студэнтаў адлічваюцца яшчэ падчас навучання, 20 працэнтаў — падчас іспытаў і больш як 10 працэнтаў — пры абароне дыпломаў. Затое адна трэць з тых, хто паступіў і дайшоў да выпуску, — гэта сапраўды высокакваліфікаваныя спецыялісты. Так і ў нас: хто хоча стаць спецыялістам — абавязкова ім стане.

Між іншым, вынікі праведзенага падчас навучальнага года рэспубліканскага маніторынгу прафесійнага самавызначэння навучэнцаў паказалі, што прафесійныя планы дастаткова канкрэтна былі вызначаны толькі ў 32% навучэнцаў 9-х класаў і 63% навучэнцаў 11-х класаў, адукацыйныя планы — у 35% і 63% навучэнцаў 9-х і 11-х класаў адпаведна. Акрамя таго, інфармацыяй аб пераліку прафесій у сферы, якая іх цікавіць, валодалі толькі 43% дзевяцікласнікаў і 66% адзінаццацікласнікаў, аб характарыстыках абранай прафесіі — 49% і 63% навучэнцаў адпаведна. Аб асабістых якасцях, якія вызначаюць прыдатнасць да пэўнай прафесіі, — 57% і 76%, а аб патрэбах свайго рэгіёна ў кадрах па выбранай прафесіі — 30% і 44% вучняў выпускных класаў.

У Міністэрстве адукацыі канстатуюць, што на працягу некалькіх апошніх гадоў назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці выпускнікоў 9-х класаў, якія робяць выбар на карысць навучання ў школе, і, адпаведна, змяншаецца колькасць выпускнікоў, якія выбіраюць атрыманне прафесіі ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А гэта, у сваю чаргу, негатыўна адбіваецца на забеспячэнні эканомікі краіны высокакваліфікаванымі кіраўнікамі сярэдняга звяна і рабочымі кадрамі. Летась у 10-х класах установу агульнай сярэдняй адукацыі працягнулі навучанне 64% выпускнікоў, ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі — 17,6% і сярэдняй спецыяльнай — 17,1%. А чаму б не вырашыць гэту праблему адміністрацыйным умяшаннем у працэс размеркавання выпускнікоў па розных каналах навучання? Чаму б не ўстанавіць на ўваходзе ў 10-ты клас для прэтэндэнтаў пэўны бар'ер па паспяховасці або ўвогуле не ўвесці экзамены?

— Мы вывучаем сёння гэта пытанне, паколькі рацыянальнае зерне ў гэтым ёсць, — прызнаецца **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.** — Тым больш што ў нашай краіне атрыманне прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі не азначае далейшы тупік у прафесійнай кар'еры. Вышэйшую адукацыю атрымаць ніколі не позна, нават пасля заканчэння прафесійна-тэхнічнай установы або ССНУ і атрымання прафесійнага стажу. Але ў такіх рашэннях трэба быць вельмі асцярожнымі, каб не падмануць чаканні дзяцей. З іншага боку, усе маладыя людзі, якія ідуць на старэйшую ступень школы з мэтай затым, як ім здаецца, «без праблем паступіць у ВНУ», павінны ўсведамляць, што мы будзем павышаць патрабаванні да прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. І «проста так» паступіць ім наўрад ці ўдасца. Таму калі вы робіце выбар на карысць навучання ў 10-11-х класах, то трэба гэтыя два гады правесці з максімальнай карысцю для сябе: трэба вучыцца, працаваць, а не спадзявацца на цуд. Магчыма, больш правільным будзе прысвяціць гэты час усё ж такі авалоданню канкрэтнай прафесіяй?

Між іншым, на думку **начальніка прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі Эдуарда ГАНЧАРА,** часта маладыя людзі не ідуць ва ўстановы прафэадукацыі не толькі таму, што «імідж некаторых з іх — не лепшы, але яшчэ і таму, то не лепшы і імідж некаторых прадпрыемстваў»:

— Лічу, што прафэхустановам і заказчыкам кадраў трэба разам ушчыльную працаваць з моладдзю, пачынаючы з правядзення прафарыентацыйнай работы. А што тычыцца сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, то даўно вядома, што калі яго кіраўнік ці спецыялісты прадпрыемства самі не падбяруць сабе ўчарашніх школьнікаў для навучання, не прапануюць ім годныя ўмовы для працы і жыцця, то ніякага эфекту не будзе. У гэтай сферы тым больш патрабуецца індывідуальны падыход.

Асобна трэба сказаць пра сайты ўстаноў адукацыі. Як правіла, змешчаная там інфармацыя не выклікае ў моладзі цікавасці. Маніторынг 240 электронных рэсурсаў устаноў адукацыі з розных рэгіёнаў паказаў, што матэрыялы, якія змяшчаюць інфармацыю па прафарыентацыі, былі прадстаўлены толькі на 92 сайтах (38% ад агульнай колькасці). Пры гэтым большасць з іх змяшчалі самую агульную інфармацыю аб выбары прафесіі, тэрмінах правядзення ЦТ... Толькі дзе-нідзе можна было знайсці інфармацыю аб школьных ці рэгіянальных прафарыентацыйных мерапрыемствах і правядзенні прафарыентацыйнай дыягностыкі.

Прыёмная кампанія ў прафесійна-тэхнічных установах распачалася 15 чэрвеня. І першыя тыдні яе паказалі, што, як і ў мінулыя гады, прывабіць навучэнцаў установам прафэадукацыі не так і проста. Тым больш што сёлета выпуск з базавай школы зменшыўся яшчэ на 6,5 тысячы чалавек і на 11,3 тысячы чалавек зменшыўся выпуск з сярэдняй школы.

Надзея НІКАЛАЕВА

АСНОЎНЫЯ ПАМЫЛКІ ПРЫ ВЫБАРЫ ПРАФЕСІІ

(парады ад спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра прафарыентацыі моладзі)

1. Няведанне правіл выбару прафесіі:
выбар прафесіі за кампанію;
перанос стаўлення да чалавека на саму прафесію;
атаясамленне вучэбнага прадмета з прафесіяй;
арыентацыя адразу на прафесіі, якія патрабуюць высокай кваліфікацыі;
няўменне вызначыць шлях атрымання прафесіі.

2. Няведанне самога сабе:
няведанне або недаацэньванне сваіх фізічных магчымасцяў;
няведанне або недаацэньванне сваіх псіхалагічных асаблівасцяў;
няўменне суаднесці свае здольнасці з патрабаваннямі прафесіі.

3. Няведанне свету прафесій:
захапленне толькі знешнім бокам прафесіі;
прадузятасць у дачыненні да прэстыжнасці прафесіі;
няведанне патрабаванняў, якія прад'яўляе прафесія да чалавека;
састарэлыя ўяўленні аб характары і ўмовах працы па канкрэтнай прафесіі.

Плануючы сваю прафесійную кар'еру, карысна адказаць на наступныя пытанні:

Ад якіх сваіх навыкаў і здольнасцяў вы атрымліваеце найбольшае задавальненне?
Якія вашы асноўныя інтарэсы і любімае баўленне часу?
Чым бы вы хацелі займацца кожны дзень па 8 гадзін з года ў год?
Пра якую працу вы марыце?
Якім вы ўяўляеце свой занятак праз 10 гадоў?
Якая работа была б для вас ідэальнай? Уявіце сябе на гэтай рабоце: з кім вы працуеце, як праводзіце час...
Якія вашы крытэрыі пры выбары прафесіі (абавязковыя і пажаданыя)?
Якія вашы моцныя бакі і навыкі дазваляюць вам лічыць, што вы падыходзіце для працы, якая бачыцца вам ідэальнай?
Якія прабелы ў сваіх уменнях і навыках вам трэба ліквідаваць, каб атрымаць ідэальную для вас працу?
Калі ідэальная для вас праца пакуль недасягальная, то якую працу вы маглі б выконваць, каб рухацца ў выбраным напрамку?
З кім можна параіцца, каб атрымаць карысную для планавання кар'еры інфармацыю?

■ Твае правы

ТРАЎМЫ І ТРАНСПАРТ

ЯК АТРЫМАЦЬ КАМПЕНСАЦЫЮ?

На жаль, грамадскі транспарт з'яўляецца месцам, дзе можна неспадзявана атрымаць траўму. Тыповая сітуацыя, у якую хоць раз трапляў кожны пасажыр: неахайны вадзіцель аўтамабіля падразае аўтобус, тралейбус ці трамвай. Кіроўца пасажырскага транспартнага сродку рэзка цісне на педаль тормазу, каб пазбегнуць сутыкнення. Як вынік — цярпяць людзі ў салоне. Усё можа абысціся без наступстваў, а можа і скончыцца бальнічным ложкам — як пашанцуе.

Па законе, усе пасажыры грамадскага транспарту застрахаваныя. Гэтая норма афіцыйна замацавана ў раздзеле 12 Палажэння аб страхавой дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, якое было зацверджана Указам Прэзідэнта ад 25 жніўня 2006 года. Але каб атрымаць ад страхавой кампаніі кампенсацыю, мала прыйсці і сказаць, што я, маўляў, выцяўся ў салоне тралейбуса. Неабходна прад'явіць важкія доказы, якія будуць сведчыць, што непрыемны выпадак адбыўся менавіта ў транспарце. У Беларусі выплатай кампенсацый у такіх выпадках займаюцца дзве страхавыя кампаніі — «Белэксімгарант» і «Белдзяржстрах». Растлумачыць алгарытм дзеяння ў такіх выпадках «Звязда» папрасіла **намесніка кіраўніка ўпраўлення абавязковага страхавання адказнасці перавозчыка перад пасажырамі і медыцынскага страхавання Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» Алену ТЫШКО:**

— Калі чалавек атрымаў пашкоджанне ў грамадскім транспарце, то першае, што ён мусіць зрабіць, — гэта паведаміць пра тое, што адбылося, кіроўцу. Калі магчыма, запісаць інвентарны нумар транспартнага сродку, а таксама прозвішча і імя вадзіцеля — картка з гэтымі звесткамі прыклеена да яго кабіны ўверсе. А таксама пазначыць прозвішчы і нумары тэлефонаў людзей, якія сталі сведкамі таго, што адбылося.

Па-другое, неабходна выклікаць на месца здарэння ДАІ і «хуткую». ДАІ зафіксуе факт здарэння, а медыкі акажуць першую дапамогу і, пры неабходнасці, даставяць у медыцынскую ўстанову для далейшага лячэння.

Наступным крокам павінна быць афармленне акта аб нанясенні шкоды жыццю і здароўю пасажыра. Увага: форма акта знаходзіцца не ў кіроўцы. Па акт трэба звярнуцца да арганізацыі-перавозчыка. У дакументе ўказваецца, хто, дзе, калі і пры якіх абставінах пацярпеў.

Пасля афармлення акта аб нанясенні шкоды жыццю і здароўю неабходна прайсці судова-медыцынскую экспертызу па накіраванні ДАІ альбо страхавой кампаніі. Эксперты вынесуць заключэнне аб цяжары атрыманых пашкоджанняў і ўстановяць, ці сапраўды траўма была атрымана ў пэўным транспартным сродку. Таму гэты этап служыць своеасаблівым бар'ерам для не вельмі сумленных людзей.

І, нарэшце, калі ўсе стадыі пройдзены, трэба ісці ў страхавую кампанію. Каб звярнуцца туды з заявай аб выплаце кампенсацыі, пры сабе неабходна мець пашпарт, заключэнне судова-медыцынскай экспертызы аб ступені цяжару цялесных пашкоджанняў, а таксама дакументы з медыцынскай установы.

— Праходжанне судова-медыцынскай экспертызы — платнае?

— Калі на судова-медыцынскую экспертызу накіроўвае ДАІ, то для пацярпелага яна праводзіцца бясплатна. Плаціць трэба ў тым выпадку, калі пацярпелага накіроўвае на экспертызу страхоўшчык.

— Якая сума кампенсацыі прадугледжана, калі факт атрымання траўмы ў транспартным сродку будзе даказаны?

— Ад трохсот да трох тысяч еўра ў беларускіх рублях па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка, устаноўленым на дзень выплаты. Сума залежыць ад ступені цяжару цялесных пашкоджанняў.

У грамадскім транспарце раз-пораз гучыць аб'ява: «Паважаныя пасажыры, каб выключыць выпадкі падзення і траўмавання, трымайцеся за поручні, якія спецыяльна для гэтага прадугледжаны». Сапраўды, выкананне гэтай няхітрай рэкамендацыі зберажэ і здароўе, і час у многіх выпадках.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

Бацькі павінны даць пісьмовы дазвол на навучанне ў ВНУ свайго дзіцяці

У сувязі з пытаннямі, якія паступаюць у прыёмныя камісіі ўстаноў адукацыі, Міністэрства адукацыі афіцыйна растлумачыла некаторыя асаблівасці арганізацыі прыёму ў ВНУ і ССНУ, звязаныя з уступленнем у сілу Кодэкса аб адукацыі і неабходнасці заключэння з усімі студэнтамі ВНУ і навучэнцамі ССНУ дагавораў на навучанне.

У прыватнасці, дагавор, які будзе падпісваць няпоўнагадовы абітурыент, у абавязковым парадку павінен быць узгоднены з яго бацькамі або законнымі прадстаўнікамі. Калі побач з абітурыентам падчас падачы дакументаў будуць знаходзіцца яго бацькі, яны павінны даць свой пісьмовы дазвол на заключэнне дагавора, а калі няпоўнагадовы абітурыент падае дакументы самастойна, то работнікі прыёмнай камісіі выдадуць яму на рукі бланк дагавора для таго, каб ён мог узгадніць яго са сваім законным прадстаўніком і накіраваць у прыёмную камісію пазней — у тэрміны, вызначаныя прыёмнай камісіяй.

«З мэтай забеспячэння правоў і законных інтарэсаў абітурыентаў, а таксама для таго, каб працэс залічэння прайшоў больш спакойна, мы рэкамендуем абітурыентам падпісваць бланк адпаведнага дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста (рабочага, служачага) яшчэ падчас падачы дакументаў у прыёмную камісію», — падкрэслівае прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія Ваніна.

Абавязкова трэба звярнуць увагу і яшчэ на адну акалічнасць. У бягучым годзе ўведзена норма, згодна з якой, калі абітурыент, у тым ліку няпоўнагадовы, па ўважлівай прычыне не можа падаць дакументы ў прыёмную камісію асабіста, ад яго імя дакументы могуць падаць яго бацькі або законныя прадстаўнікі — на падставе натарыяльна засведчанай даверанасці. Уважлівасць прычыны будзе ацэньваць прыёмная камісія. Сярод такіх прычын могуць быць, напрыклад, хвароба, удзел у міжнародных спаборніцтвах, алімпіядах і конкурсах.

Міністэрства адукацыі таксама вызначыла, што тэрмінамі залічэння абітурыентаў для атрымання адукацыі будуць лічыцца тэрміны прыняцця рашэння прыёмнай камісіяй аб прыёме (залічэнні) ва ўстанову адукацыі. Кіраўнік установы адукацыі выдае загад аб прыёме (залічэнні) абітурыента на працягу 5 дзён пасля рашэння прыёмнай камісіі. Пры гэтым адпаведныя дагаворы з абітурыентамі павінны быць заключаны да падпісання загаду.

У БЕЛАРУСІ БУДУЦЬ ПРЫЗНАВАЦЦА ДЫПЛОМЫ БАКАЛАРАЎ, А Ў РАСІІ — ДЫПЛОМЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб узаемным прызнанні і эквівалентнасці дакументаў аб адукацыі, вучоных ступенях і званнях быў падпісаны ў Мінску міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргеем МАСКЕВІЧАМ і міністрам адукацыі і навукі Расіі Дзмітрыем ЛІВАНАВЫМ.

У прыватнасці, унесеныя змяненні дазволяць вызначыць прафесійны статус расійскага бакалаўра пры правядзенні працэдуры прызнання яго дакументаў у Беларусі і прадаставяць права ўладальнікам дыплома бакалаўра на працаўладкаванне ў Беларусі ў адпаведнасці з узроўнем і напрамкам атрыманай адукацыі. Новая рэдакцыя Пагаднення дазволіць урэгуляваць у поўным аб'ёме акадэмічныя правы ўладальнікаў дыпломаў аб сярэдняй прафесійнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. На падставе гэтых змяненняў будзе ўлічвацца таксама, што вышэйшую адукацыю ў Беларусі па некаторых спецыяльнасцях можна атрымаць за 4 або 4,5 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Скарбы Нарачы

— Калі сабраць з дна Нарачы ўсё золата і каштоўныя рэчы, згубленыя адпачывальнікамі, можна не проста разбагацець, а стаць, напэўна, самым багатым беларусам, — распавёў мой знаёмы вадалаз Косця.

Верыць яму ці не — справа чытача. Я толькі перадаю тое, што пачуў.

...На выратавальнай станцыі Косця адпрацаваў ці не дзесяць гадоў. Што, безумоўна, робіць яго слова аўтарытэтным. Цяпер змяніў працу. Але пра былыя прыгоды на «выратавалцы» не забывае, і, як толькі гутарка заходзіць пра возера Нарач, не вытрымлівае і пачынае расказваць свае, трэба сказаць, цікавыя аповеды з былога.

Вось толькі некаторыя, на мой погляд — самыя-самыя.

— Гадоў пяць таму, а можа больш, адпачываў на Нарачы багаты каўказец. На курорце яго суправаджалі некалькі ахоўнікаў. Неяк захацелася госцю парыбачыць. Узяў два катары — для сябе і аховы. Заплаціў за ўвесь дзень і адправіўся, дзе глыбей. Неўзабаве, праз колькі гадзін, адно судна каўказца прычаліла да выратавальнай станцыі. Твар багацея, які да рыбалкі свяціўся ўсмешкай і задаволенасцю жыццём, рэзка змяніўся: было відаць, што нешта здарылася нядобрае.

— Хлопцы, дапамажыце, — без усякай крутасці загаварыў госць з вадалазамі. — Не ведаю, як такое магло здарыцца... Калі я закідваў вуду, з маёй рукі зляцеў каштоўны для мяне бранзалет — падарунак бацькі. Мае хлопцы ныралі, не знайшлі. Можа, вам удасца? Шчодра заплачу.

Як не дапамагчы іншаземцу, тым больш абяцае добры ганарар? Пакінулі дзяжурнага і некалькі чалавек на станцыі на выпадак аказання дапамогі. Дамовіліся, што каўказцаву «прэмію» падзеляць на ўсіх, і адправіліся на глыбіню, дзе стаяў катар ахоўнікаў.

— Шукалі мы гэты бранзалет гадзіны тры, а можа і больш, — успамінае Косця. — Глуха. Мо яго падводным цячэннем аднесла ці пяском прысыпала? Гэта ж не чалавек, якога намацаць можна. Бранзалет на дне — як іголка ў стозе сена.

Калі мы падняліся на катар і сказалі, што нічым дапамагчы не можам, ахоўнікі нас абшукалі.

— Толькі без крыўды, — нібы перапрашаў каўказец, калі яго світа нас «шманала». Я не думаю, што вы яго прыхавалі. Але на ўсякі выпадак. Бранзалет каштуе 7 тысяч еўра. Ён інкруставаны алмазамі і брыльянтамі. Ды Бог з імі. Яго ж мне бацька падараваў на паўналецце. Ён мне амулетам быў. Бацька даўно памёр, а вось цяпер і яго падарунка няма. Вельмі шкада...

— Каўказец, — працягвае Косця, — быў сапраўдным мужыком: сказаў — зрабіў. За спробу знайсці бранзалет, кожнаму з нас даў па 50 «зялёных». І пачаставаў...

Ведаю, што калегі і пасля працы, у адзіночку, спрабавалі яго знайсці. Можа, каму і ўдалося. Хто ж прызнаецца?..

Колькі мы ключоў ад кватэр, ад дарагіх іншамарак знаходзілі... А потым многае з такіх находак не вярнулася да гаспадароў. Таму і ляжаць у нас гадамі, чакаюць, пакуль за імі прыйдуць. Відаць, тыя, хто згубіў, своечасова не заўважылі страту, таму і не ведаюць, куды звярнацца.

Яшчэ выпадак. Пазамінулым летам прыйшоў на выратавалку мінчанін. Расказаў, што пайшоў купацца ў шортах. Забыўся дастаць бумажнік, у якім былі пасведчанне кіроўцы, банкаўскія карткі, патрэбныя візіткі, і значная сума грошай. Нешта каля 500 долараў. Далі яму чалавека. У паказаным месцы — вады было па грудзі — калега знайшоў страчанае.

Як аддзячыў? Аніяк. «Дзякуй» сказаў. На гэтым і разышліся.

Было, і не раз, калі шукаем тапельца — знойдзем які-небудзь залаты ланцужок або пярсцёнак. Пытаемся ў родных загінулага: «Была такая ў яго рэч?». Не! Што рабіць? Такая здабыча, калі ніхто не заявіць аб знікненні, дастаецца таму, хто знайшоў.

Любіць Косця ўспамінаць і пра ключы ад новенькага «Мерседэса», якія некалі згубіў расіянін. Той плаваў на лодцы, рэчы былі з ім. Вырашыў нырнуць. Ад штуршка лодка перакулілася. На дно пайшло ўсё. Наконт «шмотак» расіянін замарочвацца не стаў, адразу стаў шукаць ключы ад новенькага, нядаўна купленага «Мерса». Мацаў рукамі дно, разграбаў пясок — безвынікова. Папрасіў вадалазаў. Хлопцы знайшлі ключы пасля першага апускання пад ваду. Расіянін проста скакаў ад радасці. Пасля работы выратавальнікаў запрасіў на шашлык.

Сам асабіста Косця знайшоў швейцарскі гадзіннік. Не, не на працы. Проста пайшоў купацца. Нырнуў пад ваду і звыкла расплюшчыў вочы. Бачыць, нешта ляжыць на дне, пераліваецца. Якраз прамень сонца падаў на тое месца. Падплыў бліжэй і дастаў трафей. Наручны гадзіннік, па ўсім відаць, дарагі. Калі верыць знаёмаму, фірма — ULYSSE NARDIN. Не ведае Косця, колькі ён праляжаў на дне. Але і сёння паказвае час. Падараваў трафей сыну.

Колькі яшчэ каштоўных рэчаў ляжыць на дне Нарачы ды іншых азёраў Мядзельшчыны? Не падлічыць і самы дакладны матэматык. Але шанц іх знайсці ёсць у кожнага, хто сюды прыедзе.

Галоўнае пры гэтым — не папоўніць водны скарб сваімі ўласнымі пярсцёнкамі ды бранзалетамі.

Аляксандр СЯНЮЦЬ.

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенных на условиях, утвержденных протоколом Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 04.04.2006 № 36, ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении с 25 августа 2012 года до 31% годовых размера процентной ставки по договорам банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенным в период с 04.04.2006 до 25.07.2012 года.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Вниманию акционеров
ОАО «Белгорхимпром»!

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белгорхимпром» состоится 6 августа 2012 года в 11.00 по адресу:
г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал.
Повестка дня:
1. О внесении изменений в устав ОАО «Белгорхимпром».
Регистрация акционеров — в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).
Наши реквизиты:
ОАО «Белгорхимпром», 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 17, р/с 3012000007206 в ф-ле 510 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Куйбышева, 18, код 603, УНН 600024712, ОКПО 04721802.

Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю Уладзіміра Міхайлавіча СТОМЫ, начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, і выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

■ Майстры

МНЕ Б У НЕБА!

Мікалая Ярмоленку з пасёлка Цітаўка, што ў Бабруйску, усе называюць «мясцовым Кулібіным». Ён сваімі рукамі сабраў самалёт, мотадэльтаплан, а яхта яшчэ ў працы!



Мікалаю Мікалаевічу ўжо за 60, у яго няма спецыяльнай адукацыі, але гэта зусім не перашкаджае яму рабіць сваімі рукамі проста неверагодныя рэчы.

— Без руху я згіну, — кажа мужчына. — Асабліва цяпер, на пенсіі, сядзець нельга, а трэба рухацца.

На падворку Ярмоленкі нават альтанка незвычайная: яна круціцца, нібыта карусель, наверсе прапелер, а пад ім гарыць чырвоны ліхтар ад старога савецкага трактара. Але галоўная гордасць гаспадара — уласны авіяпарк. Невялікі самалёт, сабраны, як кажа сам Мікалай Мікалаевіч, «з таго, што было». А быў, напрыклад, рухавік са снегахода. Сем гадоў спатрэбілася, каб зрабіць самалёт і... паляцець на ім.

Новае захапленне — гэта мотадэльтаплан. Пасля года карпатлівай працы і на ім магчыма падняцца ў неба, але не хапае толькі крыла (альбо ветразя): на яго папросту няма грошай, бо ён каштуе некалькі тысяч долараў. Аднак і цяпер на мотадэльтаплане можна з ветрыкам пракаціцца па вуліцы Цітаўкі. «Ад вінта!» — камандуе пенсіянер. Хуткасць прыстойная, і, падаецца, што яшчэ трохі — і сапраўды рване ў неба!

А вось як быць з рачнымі прасторамі? У гаспадарчым памяшканні Ярмоленка паказвае цікаўным людзям сапраўдную 9-метровую яхту. Аказваецца, яхта — гэта не адметнасць жыцця выключна багатых і знакамітых. Яе можна пабудаваць і ў Цітаўцы. На яхту ў Мікалая Мікалаевіча пайшло шмат часу, сіл і матэрыялу, але дабудаваць яе пакуль не ўдаецца.

— Можа, і аддам каму-небудзь, — гаворыць майстар. — Бо шкада сваёй працы. А ў будучым можна было б гэтую яхту на ваду паставіць і зрабіць там, напрыклад, бар. Чаму б і не? Было б жаданне.

Алена КАЗЛОВА

■ Здарэнні

«Ніва» «ўляцела» ў самазвал

У Пружанскім раёне «Ніва» ўрэзалася ў самазвал. Тры пасажыры легкавіка трапілі ў бальніцу, кіроўца загінуў.

Паведамленне пра здарэнне паблізу вёскі Каплі паступіла ў 4.45 раніцы. На месцы высветлілася, што аўтамабіль «ВАЗ-2121 «Ніва» сутыкнуўся з грузавым аўтамабілем «МАЗ», які стаяў, — паведаміў старшы інспектар цэнтра прапаганды МНС Алег Малевіч. — У легкавіку знаходзіліся чатыры чалавекі. Два з іх самастойна пакінулі салон машыны да прыбыцця нашых падраздзяленняў. Яшчэ аднаго пасажыра давялося дэблакіраваць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Апавяшчальнік захаваў дом бабулі

У Віцебскім раёне дзякуючы таму, што ў доме 69-гадовай жанчыны, якая пражывае адна, спрацаваў пажарны апавяшчальнік, загаранне аператыўна ліквідавалі.

Аўтаномны пажарны апавяшчальнік быў устаноўлены пяць гадоў таму за сродкі сельскага Савета. Пажар адбыўся вечарам у вёсцы Сянькова з-за кароткага замыкання электраправодкі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

ТРЫЦЦАЦЬ ВЯСЕЛЬНЫХ БУКЕТАЎ

Пяты парад нявест стаў міжнародным



Нараўне з беларускімі прадстаўніцамі ў свяце нявест прынялі ўдзел дзяўчаты з Расіі. «Нявесты ў стылі арыгамі» і «Святочныя нявесты», «Нявесты-іншаземкі» і «Newвесты», «Казачныя нявесты» — традыцыйна ўдзельніц падзялілі на 5 камандаў. У парку Горкага кожная каманда прадэманстравала свае таленты ў творчай візітоўцы «120 секундаў славы». Пасля творчага конкурсу дзяўчаты закідалі гледачоў вясельнымі букетамі. Іх столькі, колькі і нявест — трыццаць. Дзяўчаты разам з арганізатарамі праекта ўсклалі кветкі да Вечнага агню на Плошчы Перамогі. Пасля чаго шыкоўны картэж з кабрыялетаў з прыгажунямі праехаў па сталічным праекце Незалежнасці ў клуб, дзе прайшла забаўляльная праграма і цырымонія ўзнагароджання.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Даты Падзеі Людзі

1761 год — нарадзіўся Якуб Ясінскі, ваенны і палітычны дзеяч, адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 года, інжынер, паэт, генерал-лейтэнант. Належаў да радыкальнай групоўкі «віленскіх якабінцаў», якія рыхтавалі паўстанне, заклікалі выкарыстоўваць вопыт французскай рэвалюцыі, выступалі за адмену прыгонніцтва. У 1794 годзе прызначаны камендантам узброеных сіл ВКЛ, кіраваў арганізацыяй новай арміі, набіраў у войскі шляхту, мяшчан, сялян. Пісаў вершаваныя лістоўкі да сялян на беларускай мове. Загінуў у 1794 годзе.

1728 год — з Ніжне-Камчацкага астрога выйшаў у плаванне карабель «Святы Гаўрыіл», пабудаваны капітанам-камандорам Вітусам Берынгам і яго паплечнікамі. Берынг абышоў усходні бераг Камчаткі, паўднёвы і ўсходні берагі Чукоткі, адкрыў востраў Святога Лаўрэнція. З-за дрэнных умоў надвор'я ён адмовіўся працягнуць шлях на поўнач і, бачачы, што зямля больш у той бок не распасціраецца, палічыў пытанне аб наяўнасці праліва паміж Азіяй і Амерыкай вырашаным. Праліў быў названы Берынгавым, хоць першым яго адкрыў яшчэ у 1648 годзе Сямён Дзяжнёў. Проста справаздача Дзяжнёва была выяўлена толькі ў 1736 годзе.

1934 год — нарадзіўся (вёска Глыбачка Ушацкага раёна) Генадзь Міхайлавіч Гарбук, акцёр, народны артыст Беларусі (1980). Працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа, з 1962 года — у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Акцёр самабытнай індывідуальнасці. Яго мастацтву ўласцівыя моцны тэмперамент, глыбокае псіхалагічнае разуменне характару, эмацыянальнасць, напружаны драматызм. У яркіх вобразах увасобіў беларускі нацыянальны характар. Найбольш вядомыя ролі: Васіль Дзятлік («Людзі на балоце» І. Мележа), Сымон («Раскіданае гняздо» Я. Купалы), Акцёр («На дне» М. Горкага) і іншыя. Здымаўся ў тэле-і кінастужках «Трэцяе пакаленне», «Трывожнае шчасце», «Белыя росы», «Чорны замак Альшанскі», «Знак бяды» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1966, 1984). Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў (1984) і медалём Францыска Скарыны.

Было сказана

Ян Чачот (1796—1847), паэт-рамантык, фальклярыст, этнограф і драматург:

«Шчасны, хто марыць умее, свабодны, каб услед за марай ісці».

АСУДЗІЛІ КВАТЭРНУЮ МАХЛЯРКУ

У Віцебску асудзілі махлярку, якая пры здачы кватэр у Віцебску і Мінску падманула 43 чалавекі. Гэтая крымінальная гісторыя атрымала вялікі грамадскі рэзананс.

33-гадовая рабочая аднаго з віцебскіх абутковых прадпрыемстваў спачатку здавала жыллё ў Віцебску (сваю кватэру і чужую). У інтэрнэце размясціла адпаведную аб'яву, і людзі пачалі ёй тэлефанаваць.

Пры сустрэчы хітрая дама брала ў некаторых аванс, але пасля гэтага многія з яе кліентаў так і не засяліліся. Іншым «пашанцавала» больш: нават рэчы пакінулі ў кватэры, ды толькі гаспадыня зацягвала засяленне. Маўляў, трэба яшчэ трохі пачакаць, пакуль свае рэчы перавязе ў іншую кватэру. І суграмадзяне ёй верылі. Дарэчы, сярод падманутых былі і тры пары закаханых. Некаторыя рэчы сваіх кліентаў зладзейка «экспрапрыявала»: два ноўтбукі і зарадныя прылады да іх. Падманутыя людзі звярнуліся па дапамогу ў міліцыю, пачалі заводзіцца крымінальныя справы, потым пачаліся слуханні ў судзе. А хітрая «ранцье», якая знаходзілася пад хатнім арыштам, каб кампенсаваць страту пацярпелым, прыехала ў Мінск і пачала там аналагічным чынам зарабляць грошы. Сама зняла кватэру і потым пачала яе здаваць унаём.

— Махлярка дзейнічала ў перыяд са снежня 2010 года па сакавік 2012-га. У Віцебску падманула 22, а ў Мінску — 21 чалавека. Агульная страта, якую яна нанесла сваім кліентам, перавышае 53,2 мільёна рублёў, — паведаміла «Звяздзе» **Вольга ЯНУШ, памочнік пракурора Кастрычніцкага раёна г. Віцебска.** — Прыгаворам суда яна была пазбаўлена волі тэрмінам на чатыры гады з канфіскацыяй маёмасці. Некаторыя пацярпелыя праз суд патрабавалі кампенсаваць ім і маральную шкоду ў памерах ад 500 тысяч да мільёна рублёў.

Зараз у Віцебску яшчэ па трох аналагічных фактах заведзены і расследуюцца крымінальныя справы. Значыць, ужо асуджанай зладзейцы давядзецца адказваць і за іншыя падманы.

20-ГАДОВЫ ВЕЛАСІПЕДЫСТ ЗАГІНУЎ

У вёсцы Задарожжа Сенненскага раёна вадзіцель аўто «Рэно Лагуна» пры абгоне наехаў на веласіпедыста, які рухаўся ў спадарожным кірунку. Супрацоўнікам ДАІ вадзіцель растлумачыў, што той раптам выехаў на сустрэчную паласу руху. 20-гадовы веласіпедыст загінуў на дарозе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Выпрабавана на сабе

РАКІ ВЯРНУЛІСЯ НА ПОЛАЧЧЫНУ,

АБО Як я на чэмпіянаце ракаў лавіў

На першых у Беларусі спаборніцтвах па спартыўнай лоўлі ракаў, што адбыліся ў мінулую нядзелю ў Полацкім раёне, у ліку спартсменаў быў карэспандэнт «Звязды». Для журналіста дазвол паўдзельнічаць у чэмпіянаце стаў нечаканасцю, бо ён у першы раз у жыцці пайшоў па ракаў. Удала.

Ракі вярнуліся!

У камандзіроўку на першы «ракавы» чэмпіянат аўтар гэтых радкоў адправіўся са старэйшым сынам — сямігадовым Міхаілам Аляксандравічам. Менавіта так, дзеля жарту, бывае, прадстаўляю малога. Выхадны дзень, дык чаму б не парадаваць дзіця, якое атрымала ганаровую грамату за ўдалае сканчэнне першага класа?

Яшчэ да выезду за межы Полацка — на возера Белае — **Пётр Мяфодзьевіч ПЯТКЕВІЧ, намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях,** проста ля будынка райвыканкама расказаў пра будучую падзею, зусім не раённага маштабу. Нагадаю, менавіта Полацкі раён вядомы на ўсю Беларусь тым, што тут прайшлі першыя грыбны і чарнічны чэмпіянаты. Цяпер вось і першы ракавы.

— Мы заўсёды ў пошуку, можна так сказаць. 313 азёраў у раёне. Многія імкнуцца да вадаёмаў. Купаюцца, загараюць, але вялікая колькасць з ліку адпачывальнікаў шукаюць мэтавы занятак. Ёсць байдарачнікі, рыбаловы. А сёння на возеры Белае збяруцца аматары лавіць ракаў. Чаму «ў цэнтры ўвагі» менавіта ракі? Бо яны вярнуліся, — гаворыць Пётр Пяткевіч. Інтэнсіўнае земляробства з «хіміяй»— угнаеннямі, выкіды шкодных рэчываў, вось яны і сышлі, а зараз ракі вярнуліся. Таму, што, напэўна, палепшылася экалагічная сітуацыя.

Па назіраннях, ракі чысцяць ваду.

Трэба падкрэсліць, што спаборніцтвы праводзіліся па спартыўнай лоўлі ракаў: трэба зайсці ў вадаём, убачыць рака, рукамі яго злавіць. Потым прынесці на бераг, каб журы пералічыла.

Па дарозе на возера вельмі хацелася верыць, што надвор'е не падвядзе: з раніцы прайшоў невялікі дождж. Мо зноў пачнецца? Ці, не дай Бог, моцны лівень. Якое ж тады будзе здавальненне шукаць ракаў у сумленнай спартыўнай барацьбе?

Ніводзін рак не пацерпіць!

Возера Белае — папулярнае месца для адпачынку. Назву возера мясцовыя жыхары звязваюць з тым, што ў ім вельмі чыстая вада — празрыстая. Цікава, што ў некалькіх кіламетрах ад Белага возера ёсць Чорнае. Таксама чыстае. Чаму тады Чорнае? Казус!

— Умовы для лаўцоў простыя. Тэрыторыя возера агароджана (буйкамі. — **А.П.**) плошчай каля 400 квадратных метраў. Усе ракі, якіх трэба будзе злавіць, тутэйшыя. Каб іх пазбіраць і выпусціць для лоўлі, выкарыстоўвалі спецыяльную прынаду, на якую яны збегліся. Што за прынада — сакрэт! — расказвае **Аляксей КЛІНЫШОЎ, начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Полацкага райвыканкама.** — Падкормліваць дастаткова на працягу ночы. Удзельнікі спаборніцтва па сігнале заходзяць у ваду, а яе ўзровень не больш чым па пояс. Ныраць нельга, апускацца таксама. Лавіць можна толькі рукамі без усякіх прыстасаванняў. Калі нехта баіцца, можна ў пальчатках. І на лоўлю даецца ўсяго тры хвілінкі. Ніводзін рак не павінен пацярпець, раздаваць іх лаўцам потым не будзем. Пасля пераліку адпраўцца ў родную стыхію. Так, быў час, калі ракі зніклі. Па маіх назіраннях, гадоў 8-10 таму, а цяпер з'яўляюцца. Як правільна варыць ракаў? Асабіста я так раблю: кідаю іх у добра падсолены вар (на 10-літровае вядро з вадой 500 грамаў солі). Даводзім да кіпення і кідаем у вядро пятрушку, кроп, можна і лаўровы ліст, спецыі. І калі вада закіпіць, хай яшчэ кіпіць хвілін 15. Такі спосаб варэння больш, можна сказаць, гуманны, чым калі пачынаюць варыць, калі вада халодная, і яны там пакутуюць...

Для перамогі трэба было злавіць як мага больш ракаў. Самага вялікага або самага маленькага рака не «адзначалі» ў адпаведных намінацыях.

Як расказалі да пачатку спаборніцтваў спрактыкаваныя лаўцы, ракам усё роўна, якая тэмпература на дварэ, які ціск — жывуць сваім размераным «ракавым» жыццём. Лавіць іх можна і ў дождж, і пад сонцам. Адзінае, праўда, у сонечны дзень ракі любяць глыбіню, бо вада награваецца.

Дзмітрый КАВАЛЕЎСКІ — пераможца ў спаборніцтвах па спартыўнай лоўлі ракаў у асабістым заліку на адкрытым чэмпіянаце Полацкага раёна.

Наконт інструктажу па тэхніцы бяспекі пры лоўлі ракаў — ён вельмі кароткі: каб не шчыпаў рак, трэба хапаць яго акуратна і зверху. Калі клюшнямі зачэпіць руку, не вельмі балюча. Адзінае, што пасля гэтага застаецца на нядоўгую памяць, — «кропкі» ад іх «пацалунка» на руках.

У ваду сысці спазніўся

Арганізатары спаборніцтва казалі, што вада ў возеры празрыстая і ракаў будзе добра відаць. Іншая справа, што ракі не дурні і пачынаюць бегаць ад лаўцоў. А вы думалі — проста?

Мінск і паралельна Віцебск на першым ракавым чэмпіянаце прадстаўлялі спецыяльны карэспандэнт «Звязды» па Віцебскай вобласці і ўласны карэспандэнт газеты «Комсомольская правда в Белоруссии» Наталля Партоліна. Каляжанка добра падрыхтавалася, «з запасам» часу пераапранулася, каб, не рызыкуючы замачыць адзенне, пайсці ў ваду па ракаў.

А я не здагадаўся, што трэба было ўзяць на чэмпіянат хаця б плаўкі (і чаму пасаромеўся пайсці ў ваду ў трусах?) А як толькі падышоў да месца правядзення турніру лаўцоў, суддзя даў каманду пачаць лоўлю. А я ж думаў, што яшчэ інструктаж будзе. Давялося ўспомніць армейскія будні і за секунды зняць боты, куртку. Штаны закасаў, як і кашулю. А куды дзяваць фотаапарат? У выніку лавіў ракаў, літаральна стоячы па калена ў вадзе.

А час ідзе. Іду і я ў пошуках ракаў. Цяжка апісаць усё тое, што адчуў падчас гэтага спартыўнага «палявання». Працэс больш «узбуджальны», чым лоўля рыбы. Хаця і на апошняе часу не хапае.

Чыстая вада, мяккі пясочак пад нагамі. А дзе ракі? Во?! Не, падводная расліна. А гэта... Не — камень. І тут бачу... Ён — рак! Мой першы! Тыя пару хвілін, бо першую, паўтару, прапусціў з-за спазнення ў ваду, паказаліся мне вечнасцю. А Наталля весела крычыць, што ўжо двух злавіла. У выніку ёй «даліся» тры ракі, а мне адзін. Ад сталічнай журналісцкай каманды ў камандным выніку чатыры.

Віват, Наталля. Дзіўна, як яна яшчэ ўмудралася фатаграфаваць сапернікаў?! Думаю, прэміі мяне за прайгрыш не пазбавяць. Тым больш што як джэнтльмен не мог не саступіць даме першынства (во, «выкруціўся» ў тлумачэнні пікантнай сітуацыі!).

А як быў шчыра рады сын, калі я даў яму ў рукі «майго» рака.

І ўсё ж такі ракі — дзівосныя істоты. Ідзеш па вадзе, а яны ўсё ніжэй і ніжэй апускаюцца, пакуль не знікаюць зусім. Ці ўсё ж такі ўзлятаюць?

Беларускага рака няма!!!

У спаборніцтвах выйграла каманда Полацкага філіяла «Вясна-энерга» РУП «Віцебскэнерга» — 17 ракаў.

А ў індывідуальным заліку не было роўных **Дзмітрыю КАВАЛЕЎСКАМУ, інжынеру па здабычы і рэалізацыі рыбы полацкага рэспубліканскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм.** Высветлілася, што прадпрыемства, на якім ён працуе, дзе займаюцца рыбным промыслам — зарыбленнем натуральных вадаёмаў, нядаўна асвоіла ракавы бізнэс. Дарэчы, менавіта ён і яго калега перад пачаткам спаборніцтваў кінулі ў возера Белае для збору спартсменамі роўна 98 ракаў. І яны пасля чэмпіянату пойдуць на папаўненне матачнага статку. Дзмітрый шчыра прызнаўся, што ракаў у прамысловай нарыхтоўцы ловяць на прынаду — рыбу, якую рэжуць і кладуць у спецыяльныя «пасткі» памерамі 1,1 х 0,7 х 0,7 метра. «Скрынкі» з двума ўваходамі, усярэдзіне «акенца».

— Упершыню на Віцебшчыне месяц таму мы пачалі займацца ракамі. У перыяд з 15 ліпеня па 15 кастрычніка рака можна лавіць. Азёры, дзе ёсць ракі, — чыстыя. На дне — кварцавыя пяскі, якія працуюць, як біялагічны фільтр, — гаворыць ён. — Спрабуем адлавіць невялікую колькасць ракаў для ўласных патрэб, каб потым разводзіць на тэрыторыі рыбнага гадавальніка. Маштабы нашай дзейнасці стрымлівае ўстаноўленая квота — усяго 200 кілаграмаў за сезон. Вядома, гэта мала. Арандуем азёры і будзем разводзіць ракаў. Матачны статак жыве ў арандаваным возеры. Распрацавана спецыяльная праграма дэпартаментам меліярацыі...

Як расказаў чэмпіён па лоўлі ракаў, аказваецца, у Беларусі пакуль што прадаюцца прывазныя ракі. Расціць ракаў да прамыславага памеру — 9 сантыметраў — трэба 4-5 гадоў. Плануюць жывых ракаў пастаўляць у гандлёвую сетку. Прэйскурант — прыкладна 140 тысяч рублёў за кілаграм. Для параўнання: іншаземныя ракі, як адзначыў суразмоўца, на сёння рэалізуюцца ў Беларусі па цане больш за 160 тысяч рублёў за кілаграм. Перспектывы ў айчыннага рака добрыя.

Тым больш, ёсць што ўспомніць. Дзмітрый Кавалеўскі расказаў, што ў 1970—1980-я гады ў Полацкім раёне рыбгас актыўна займаўся ракам і рэалізоўваў далёка за межамі Віцебшчыны. І шчыра верыцца, што беларускі рак прыйдзецца даспадобы не толькі беларусам, расіянам, украінцам, але і жыхарам Еўрасаюза. Якія тут жарты! Справа можа аказацца вельмі прыбытковай. І рак можа стаць літаральна залатым, як рыбка з казкі...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Полацкі раён — Віцебск.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.11	21.21	16.10
Віцебск	4.54	21.17	16.23
Магілёў	5.01	21.11	16.10
Гомель	5.05	21.00	15.55
Гродна	5.27	21.35	16.08
Брэст	5.35	21.28	15.53

Месяц

Першая квадра 26 ліпеня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Алены, Вольгі.*
К. *Вольгі, Міхаліны, Хрысціны, Антона, Барыса, Войцеха.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+25..+27°С	КІЕЎ	+25..+27°С	РЫГА	+22..+24°С
ВІЛЬНЮС	+17..+19°С	МАСКВА	+24..+26°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+20..+22°С

УСМІХНЕМСЯ

Калі мужчына мые шкарпэткі, значыць, яны ў яго апошнія.

— Сонейка, давай памірымся!

— Ну не! Нам да «памірымся» яшчэ сварыцца і сварыцца!

У сям'і ўсё за мяне вырашае жонка, на працы — начальнік, у краіне — улады. Але ёсць адно месца, дзе ўсё вырашаю толькі я. Гэта — крыжаванка!

— Дарагая, мы ўчора пасварыліся з-за дробязі, я не меў рацыі! Ты ў мяне самая любімая жанчына.

— Ага! Я так і ведала, што я ў цябе не адна!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3264.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 ліпеня 2012 года.